

У ДРЫБІН НЕ ТОЛЬКІ ПА ВАЛЁНКІ

АТЛУСЦЕННЕ — ПАНДЭМІЯ ГЭТАГА СТАГОДДЗЯ

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 жніўня 2024 г.
СЕРАДА
№ 162 (30296)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ГЛАЗ, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў:**

*«Нашы суседзі з ЕС закрываюць пункты пропуску, уводзячы ўсё больш абмежаванняў. Па ініцыятыве гэтых краін закрыты амаль усе пагранічныя пераходы на граніцы з Беларуссю, што вымушае людзей прастойваць у даўжэзных чэргах. Усе гэтыя палітычныя падкопы супярэчаць Статуту ААН, прама парушаюць палажэнні міжнародных канвенцый і іншых праваабарончых дакументаў. Нашы суседзі экстэрытарыяльна парушаюць правы беларускіх грамадзян, у тым ліку абмяжоўваючы іх права на перамяшчэнне. За іх дзеяннямі стаяць палітычныя мэты, эканамічны дыктат, вытаргоўванне сабе ад нас нейкіх прэферэнцый, што недапушчальна!»*

# На рыштаваннях храма



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



**На сталічных вайсковых могілках ідзе рэканструкцыя царквы святога князя Аляксандра Неўскага. Яе праводзяць спецыялісты ААТ «Белрэстаўрацыя». Лепшчык Максім Чэрвяк працуе на вышыні, каля купалаў і званіцы. Ён расчышчае сцены да аўтэнтычнай цаглянай кладкі канца XIX стагоддзя.**

## КОРАТКА

• Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш накіраваў запрашэнні на імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі для ўдзелу беларускай дэлегацыі ў 3-й Канферэнцыі ААН для краін, якія развіваюцца і не маюць выхаду да мора. Форум плануецца правесці ў снежні бягучага года ў Батсване.

• **З 26 жніўня 2024 года сталічнае метро пераходзіць на зімовы рэжым работы.**

• Беларуская тэнісістка Арына Сабаленка стала пераможцай турніру WTA-1000 у амерыканскім Цынцынаці з прызавым фондам $3,2 млн.

ISSN 1990 — 763X

Будзьце пільнымі!

## «ЗАБАВЫ» НЕ ПА ЎЗРОСЦЕ

### На што звяртаць увагу бацькам, каб іх дзеці не трапілі ў поле зроку злачынцаў?

**Выпадкі, калі непаўналетнія грамадзяне становяцца фігурантамі адміністрацыйнага працэсу ці нават крымінальнай справы, на жаль, не рэдкія. Дзеці пагаджаюцца на прапановы аб лёгкім заробку, часам нават не падазраючы, чым рызыкуюць. Бацькі думаюць, што калі іх нашчадкі знаходзяцца дома і нікуды без патрэбы не выходзяць, то не варта і перажываць. Пры гэтым дарослыя нават не здагадваюцца аб тым, што, седзячы за камп'ютарам, іх дзеці здзяйсняе ашуканскія дзеянні ў інтэрнэце або ствараe лжывае паведамленне аб мініраванні. У выніку — паламаны лёс або «чорная пляма» на ўласнай біяграфіі. Як сведчыць статыстыка, бяда прыходзіць і ў самыя шчаслівыя ды забяспечаныя сем'і.**



Фота з адкрытых крыніц.

СТАР. 4

Сезонны клопат

## ПРАЦА, ПЕРШАЯ Ў ЖЫЦЦІ

### За два летнія месяцы ў краіне атрымалі часовае працаўладкаванне больш за 28 тысяч маладых грамадзян



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Самую доўгачаканую пару летніх канікул школьнікі выкарыстоўваюць па-рознаму. Малодшыя, зразумела, праводзяць свой адпачынак ад вучобы з бацькамі, у паездках, аздараўленчых лагерах або ў бабуль-дзядуляў. У падлеткаў канікулярнаму баўленню часу ёсць карысная альтэрнатыва — атрымаць першы працоўны вопыт і зарабіць першыя грошы. Разважныя бацькі такі парыў сваіх дзяцей падтрымліваюць, бо праца дазваляе не толькі здабыць першасныя прафесійныя навыкі. Яна дысцыплінуе дзіця, падымае самаацэнку, вучыць працаваць у калектыве, развівае пачуццё адказнасці. І самае галоўнае — дзеці пачынаюць разумець, што такое работа насамрэч.**

**Якія яшчэ плюсы нясе ў сабе часовае працаўладкаванне падлеткам і моладзі, якія нюансы трэба ўлічваць ім, іх бацькам і работадаўцам, мы пацікавіліся ў начальніка аддзела арганізацыі працы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва і альтэрнатыўнай службы ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Сяргея КАЦКО.**

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Аднавіць двухбаковыя адносіны, вывесці іх на яшчэ больш высокі ўзровень»

## Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана

**Гэтымі днямі парламенцкая дэлегацыя Ісламскай Рэспублікі Пакістан на чале са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Сардарам Аязам САДЗІКАМ знаходзіцца з афіцыйным візітам у Беларусі. Праграма візіту насычана мерапрыемствамі і сустрэчамі. Асноўная адбылася ў Палацы Незалежнасці.**

Беларускі лідар нагадаў, што ёсць нядаўняя дамоўленасць з прэм'ер-міністрам Пакістана аднавіць, прарэвізаваць двухбаковыя адносіны, вывесці іх на яшчэ больш высокі ўзровень, чым гэта было раней. У гэтай сувязі бакі дамовіліся выпрацаваць сумесны план, дарожную карту на 2025—2027 гады, дзе будуць вызначаны асноўныя кірункі двухбаковага супрацоўніцтва.

«Я б вельмі хацеў, каб парламентарыі нашых краін былі ўцягнуты ў стварэнне гэтага плана нашых адносін — паміж Беларуссю і Пакістанам, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Ствараючы гэтую дарожную карту, давядзецца ажыццявіць рэвізію нашых нарматыўна-прававых актаў, нашых пагадненняў, меморандумаў, дагавораў, падпісаных паміж дзвюма краінамі. І ў гэтай частцы дэпутаты змаглі б садзейнічаць больш якаснай распрацоўцы дарожнай карты».

Кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць пакістанскаму боку за падтрымку Беларусі ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, а таксама пры ўступленні нашай краіны ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. «У нас у гэтых і іншых міжнародных арганізацыях склаліся добрыя адносіны падтрымкі адно аднаго, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Трэба працягваць такую палітыку, паглыбляць яе — Беларусь да гэтага гатова».

Прэзідэнт выказаў зацікаўленасць у тым, каб дэпутаты парламента абедзвюх краін падключыліся да работы беларуска-пакістанскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве і падштурхоўвалі яе ў рабоце. Па словах беларускага лідара, гэта стала б добрай дапамогай у рабоце камісіі.

Кажучы аб тавараабароце паміж Беларуссю і Пакістанам за апошнія гады, Прэзідэнт адзначыў, што ў сярэднім ён роўны або крыху вышэйшы за 50 мільёнаў долараў. «Пагадзіцеся, што тавараабарот высокатэхналагічнай Беларусі і такой краіны ў дзвесце з лішнім мільёнаў чалавек мізэрны, — канстатаваў ён. — Таму нам трэба паглыбляць і пашыраць па наменклатуры наш тавараабарот».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што беларускі бок гатовы задаволіць інтарэс пакістанскай парламенцкай дэлегацыі падчас візіту ў нашу краіну і прадставіць Беларусь па ўсіх кірунках, да якіх ёсць цікавасць.

У сваю чаргу Сардар Аяз Садзік выказаў удзячнасць беларускаму лідару за каштоўны час, вылучаны для сустрэчы. Ён перадаў Прэзідэнту самыя цёплыя пажаданні ад прэм'ер-міністра Пакістана і асаблівыя пажаданні — ад лідара партыі, спадара Наваза Шарыфа (прэм'ер-міністра Пакістана з 2013 да 2017 гг. — **«Зв»**.).

**Вераніка КАНЮТА.**

**У тэму**

У размове з журналістамі **Сардар Аяз САДЗІК** адзначыў, што прыехаў у Беларусь з парламенцкай дэлегацыяй, уключаючы камісіі па сельскай гаспадарцы, фінансах і прамысловасці. Ён выказаў удзячнасць Прэзідэнту Беларусі за магчымасць правесці сустрэчу, якая, па яго словах, працягвалася нашмат больш, чым было запланавана.

«Мы абмеркавалі шырокае кола пытанняў, у тым ліку і праблемных, вырашэнне якіх было знойдзена з дапамогай Прэзідэнта адразу ж, уключаючы пытанні выдачы віз студэнтам, прадстаўнікам дзелавога сектара Пакістана, — падкрэсліў спікер Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана. — Вядома, была абмеркавана тэматыка сельскай гаспадаркі, паставак беларускай тэхнікі, у прыватнасці беларускіх трактароў, якія карыстаюцца асаблівым поспехам у Пакістане».

Спікер пакістанскага парламента павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з уступленнем Беларусі ў склад Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і выказаў сваю асабістую падтрымку. «У сілу геаграфічнага размяшчэння Беларусь іграе ключавую ролю ў транснацыянальным гандлёвым калідоры «Адзін пояс — адзін шлях», — падкрэсліў ён. — У рамках маёй другой кадэнцыі ў якасці спікера парламента Пакістана Беларусь і Пакістан падпісалі пагадненне аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Цяпер мы маем намер зноў паглядзець на гэты дагавор з мэтай актывізацыі двухбаковых сувязяў. Тавараабарот дзвюх краін не адказвае патэнцыялу, які існуе, таму мы маем намер абменьвацца візітамі дзелавых колаў. Мы таксама плануем прапрацаваць пытанне аб магчымасці адкрыцця цэнтраў па продажы і абслугоўванні беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі ў Пакістане, арганізаваць абмен на ўзроўні экспертаў».

Спікер адзначыў, што Беларусь — вельмі «зялёная» краіна, а беларуская драўніна адрозніваецца высокай якасцю. Невыпадкова Пакістан зацікаўлены ў арганізацыі паставак беларускай мэблі, а таксама ў стварэнні сумесных вытворчасцяў.

Па словах Сардара Аяза Садзіка, у кастрычніку гэтага года чакаецца візіт высокапастаўленай дэлегацыі Беларусі ў Пакістан. «У цэлым, выдатная краіна, людзі вельмі ветлівыя і гасцінныя, — кажучы аб сваім візіце ў нашу краіну, адзначыў спікер пакістанскага парламента. — Для сябе я вырашыў, што абавязкова вярнуся сюды ў якасці турыста».

Парламенцкі дзённік

# ЖЫЦЬ ПА СВАІХ ТРАДЫЦЫЯХ І ЗАКОНАХ

## Наталля КАЧАНАВА прапанавала пакістанскім парламентарыям узмацніць супрацоўніцтва па лініі міжнародных арганізацый

**Падчас сустрэчы ў Савеце Рэспублікі яго кіраўнік выказала ўпэўненасць у тым, што візіт пакістанскай парламенцкай дэлегацыі ў нашу краіну надасць новы імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву. Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што і ў Беларусі, і ў Пакістане сёлета прайшлі парламенцкія выбары, павіншавала калегу з выбраннем на высокую пасаду.**



Фота БелТА.

«Беларусь і Пакістан звязваюць добрыя сяброўскія адносіны, і, перш за ўсё, у гэтым заслуга лідараў нашых краін, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Мы назіралі за вашай сустрэчай з Прэзідэнтам нашай краіны і пачулі тыя задачы, якія мы павінны рэалізоўваць. Аб тым, што мы павінны падняць наша супрацоўніцтва на больш высокі ўзровень, казалі і нашы лідары ў ходзе сустрэчы (падчас саміту ШАС у Астане ў пачатку ліпеня. — **«Зв»**.). Гэтаму будзе садзейнічаць, вядома, і наша міжпарламенцкае ўзаемадзеянне».

Кажучы аб важнасці ўзаемадзеяння на міжнароднай арэне, Наталля Качанава адзначыла гатоўнасць і далей супрацоўнічаць у рамках такіх міжнародных арганізацый, як ААН, Рух недалучэння, ШАС. «Спадзяёмся, што наша супрацоўніцтва будзе плённым, на карысць нашых краін і народаў, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Паміж нашымі краінамі выбудаваны добрыя адносіны, створана міжурадавая камісія, працуюць дагаворныя адносіны, падпісаны дагаворы, мемарандумы, пагадненні. Вядома, яны павінны працаваць больш эфектыўна, каб мы бачылі вынік гэтага супрацоўніцтва ў рэаліях. Мы, са свайго боку, прыкладзём намаганні, каб наша супрацоўніцтва было больш плённым».

Кажучы аб партнёрстве ў гуманітарнай сферы, спікер канстатавала, што супрацоўніцтва ў сістэме адукацыі, аховы здароўя, культуры і турызму — гэта асноватворнае ў сяброўстве паміж беларускім і пакістанскім народамі.

Наталля Качанава расказала калегам аб прынцыпах работы Савета Рэспублікі як палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Яна падкрэсліла, што пагадненні аб супрацоўніцтве з Пакістанам падпісаны практычна ўсімі абласцямі Беларусі. Для эфектыўнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі пры Нацыянальным сходзе Беларусі створана рабочая група, якую ўзначальвае дэпутат Віктар Нікалайкін, намеснікам кіраўніка гэтай рабочай групы з'яўляецца сенатар Міхаіл Русы.

Па словах Наталлі Качанавай, парламентарыі падключацца да распрацоўкі дарожнай карты аб супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі на 2025—2027 гг., прыкладуць усе намаганні для таго, каб дамоўленасці, якія існуюць паміж нацыянальнымі лідарамі, былі эфектыўна рэалізаваны, а сяброўства паміж народамі ўзмацнялася. «Усе працэсы, якія адбываюцца ў свеце, хвалююць нас усіх, бо мы — прадстаўнікі народа, і мы ўсе разам павінны зрабіць так, каб мір і спакой былі ў нашых краінах і мы маглі жыць па сваіх традыцыях, у адпаведнасці са сваімі законамі», — рэзюмавала спікер.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «МЫ ГАТОВЫ ДА АДКРЫТАЙ, ДАВЕРЛІВАЙ РАЗМОВЫ»

**Беларусь наведвае парламенцкая дэлегацыя Ісламскай Рэспублікі Пакістан на чале са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Сардарам Аязам САДЗІКАМ. Ініцыятарам афіцыйнага візіту выступіла Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

Падчас сустрэчы беларускіх і пакістанскіх парламентарыяў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** зазначыў, што нашай краінай надаецца вялікае значэнне адносінам з Пакістанам. Як у эканамічнай сферы, так і ў гуманітарнай. Ён падкрэсліў, што Пакістан займае стратэгічнае становішча ў Азіі і вядзе актыўную знешнепалітычную дзейнасць: рэспубліка ўдзельнічае ў больш як 60 глабальных і рэгіянальных міжнародных арганізацыях.


Фота БелТА.

Спікер адзначыў таксама цёплае стаўленне да Ісламскай Рэспублікі нашага Прэзідэнта, сведчаннем чаго з'яўляецца і сама сённяшняя сустрэча, і ранейшы абмен візітамі, і правядзенне сустрэч на вышэйшым узроўні ў 2015—2016 гадах, і ажыццёўленыя кантакты ў рамках Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў 2022 і 2024 гадах. Ігар Сергяенка выказаў упэўненасць у тым, што рэалізацыя дасягнутых раней дамоўленасцяў і іх перазагрузка сёння адбудзецца пры актыўным удзеле парламентаў абедзвюх краін і будзе садзейнічаць развіццю ўсебаковага супрацоўніцтва.

Асобна ён падкрэсліў ролю парламента Пакістана ў працэсе ўступлення нашай рэспублікі ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва — менавіта пакістанскія заканадаўцы аднымі з першых ратыфікавалі Мемарандум аб абавязацельствах Беларусі ў мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена ШАС. Акрамя таго, ён адзначыў, што Беларусь і Пакістан канструктыўна ўзаемадзейнічаюць і падтрымліваюць адзін аднаго ў міжпарламенцкім саюзе. Сёння беларускі бок разглядае пытанне аб наладжванні дыялогу з Азіяцкай парламенцкай асамблеяй і Парламенцкім саюзам Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва. Парламент Пакістана прадстаўлены ў гэтых арганізацыях, і Ігар Сергяенка выказаў надзею, што пакістанскія калегі падтрымаюць намер Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь падключыцца да іх дзейнасці.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Ігар Сергяенка паведаміў, што бакі абмяркоўвалі пытанні актывізацыі міждзяржаўных кантактаў, развіцця гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, а таксама павышэння ролі дэпутацкіх карпусоў у гэтых працэсах.

— Непасрэдна прыйшлі да пэўных высноў, у якіх напрамках трэба нарасціць наша ўзаемадзеянне. У першую чаргу, каб развіваць эканоміку нашых краін, развіваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва і аб тым, каб унесці карэктывы ў існуючую нарматыўна-прававую базу — гэта непасрэдна задача парламента. Практычна па ўсіх пытаннях, якія абмяркоўваліся, знойдзены пункты судакранання, ёсць зацікаўленасць у развіцці ўзаемавыгадных адносін, — канстатаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

Жніво-2024

# БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ

## Уборка збожжавых і зернебабовых культур блізіцца да фінішу

**Сёння збожжавыя і зернебабовыя ўбраны на 96 % плошчаў, намалочана 6 мільёнаў 550 тысяч тон збожжа ўсіх катэгорый. З улікам рапсу агульны намалот склаў 7 мільёнаў 628 тысяч тон.**

Як паведаміў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН**, сёлета плануецца сабраць больш за 50 тысяч тон грэчкі і проса. Паводле ацэнак спецыялістаў і вучоных, у гаспадарках усіх катэгорый намалот з улікам кукурузы і рапсу складзе больш як 10 мільёнаў тон.

Ён зазначыў таксама, што сёння аграрыі паралельна з уборкай заняты сяўбой азімага рапсу, падрыхтоўкай да сяўбы азімых збожжавых. У асобных гаспадарках пачалі збіраць ураджай ранняй бульбы і агароднiны.

Спыніўся намеснік міністра і на дасягненнях хлебаробаў.

— У 13 раёнах краіны намалацілі больш за 100 тысяч тон збожжа, у Гродзенскім — 220 тысяч тон. У пяці сельгасарганізацыях ураджайнасць збожжавых і зернебабовых склала звыш 100 цэнтнераў з гектара, — адзначыў Уладзімір Гракун. — Калі казаць аб рэкордных выніках сярод камбайнераў, то назаву механізатара СВК «Гродзенскі» Гродзенскага раёна Сяргея Шантыра, які намалаціў 6 тысяч 665 тон, — гэта найвышэйшы вынік у рэспубліцы. Усяго ў краіне тры камбайнавыя экіпажы сабралі больш за 5 тысяч тон збожжа, дзевяць — больш за 4 тысячы, 58 — 3 тысячы, 382 — больш за 2 тысячы і 2277 — больш за тысячу тон.

Таксама ён зазначыў, што без выканання ўсіх элементаў тэхналогій, прафесіяналізму і адказнасці спецыялістаў, а таксама выканальніцкай і тэхналагічнай дысцыпліны на месцах атрымаць добры ўраджай папросту немагчыма.

Гаворачы аб папярэдніх выніках жніва, намеснік міністра заўважыў, што сёлета ўраджай будзе большы за леташні, што гаспадаркі ў цэлым спрацавалі ядрэнна, хаця маглі б атрымаць і вышэйшыя рэзультаты.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**



Весткі з Кітая

# NEW-АЎТО З МЯСЦОВАЙ «ПРАПІСКАЙ»

## У Беларусі будуць збіраць кітайскія электракары

**Вывучаецца магчымасць арганізацыі вытворчасці ў Беларусі аўтамабіляў на новых крыніцах энергіі (NEW). Аб гэтым «Звяздзе» паведаміў віцэ-прэзідэнт кітайскай кампаніі Hozon Auto Чжоў Цзян.**



Гэтая кампанія была заснавана ў 2014 годзе ў Чжэцзяне сумесна з Sinohytec і універсітэтам Цынхуа. У 2018 годзе яна адкрыла Цэнтр даследаванняў аўтаномных транспартных сродкаў у Крамянёвай даліне, а ў сакавіку 2019-га — Цэнтр дызайну ў Пекіне. Штаб-кватэра кампаніі знаходзіцца ў Ганконгу, а ў Шанхаі, дзе давялося пабачыць перавагі Hozon Auto, — аператыўны цэнтр. Першы канцэпт-кар быў прадстаўлены ў 2017 годзе. Першы серыйны аўтамабіль з'явіўся ў 2018-м, а продажы пачаліся праз год. Летась у сакавіку кампанія Hozon Auto аб'явіла аб будаўніцтве свайго замежнага вытворчага аб'екта ў сталіцы Тайланда Бангкоку. Завод адкрыўся сёлета, ён скіраваны на вытворчасць і экспарт электрамабіляў з правым рулём у краіны АСЕАН. Таксама працуе вытворчасць і ў Інданезіі.

Neta — гэта масавы брэнд аўтамабіляў на новых крыніцах энергіі. Пад гэтай маркай у Кітаі цяпер выпускаюцца мадэлі з рознымі тыпамі кузава, якія абсталёўваюцца як электрычнымі, так і гібрыднымі сілавымі ўстаноўкамі. Кампанія імкліва развіваецца: сёлета за першае паўгоддзе продажы Neta павялічыліся на 154 працэнты ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Як адзначыў Чжоў Цзян, прадукцыя карыстаецца папулярнасцю больш чым у 40 краінах. Пры гэтым геаграфія пашыраецца: да канца года пастаўкі будуць ажыццяўляцца ў паўсотню дзяржаў.

Накont Беларусі ў Hozon Auto асаблівыя планы. Кампанія возьме ўдзел у трэцяй Выставе кітайскіх тавараў і паслуг, якая пройдзе 25—28 жніўня на пляцоўцы Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». У ёй будуць удзельнічаць каля 200 кампаній з Паднябеснай. Летась у выставе сваю прадукцыю прадставіла 131 кампанія. Тады яе наведалі каля 10 тысяч чалавек, а агульная сума заключаных папярэдніх здзелак дасягнула 20 мільёнаў долараў.

Канцэпцыя выставы прадугледжвае інтэграцыю попыту і прапановы Кітайскай Народнай Рэспублікі і Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама стымуляванне міжрэгіянальнага гандлю. Як адзначылі ў парку, выстава праводзілася двойчы — у 2019-м і 2023 гадах, атрымаўшы высокую ацэнку абодвух бакоў. Яна зарэкамендавала сябе паспяховым мерапрыемствам у рамках усепадгнага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства паміж Кітаем і Беларуссю, стала канкрэтным крокам па рэалізацыі Сумеснай дэкларацыі дзвюх краін, садзейнічаючы паглыбленню і развіццю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

— Мы дакладна вывучым умовы для належнай адаптацыі да беларускага рынку — адзначыў Чжоў Цзян. — Кампанія разглядае вашу краіну як перспектыўны напрамак для пашырэння паставак. Больш за тое, вывучаецца магчымасць для адкрыцця ў Беларусі вытворчасці аўтамабіляў. Перакананы, што супрацоўніцтва будзе паспяхова пашырацца.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ,**
**фота аўтара.**

*Шанхай.*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Звыш 7,3 мільёна чалавек на захадзе Афрыкі сталі бежанцамі



Гэта адбылося ў выніку ўзброеных канфліктаў і стыхійных бедстваў, заявіла намеснік старшыні Камісіі Эканамічнай супольнасці краін Заходняй Афрыкі (ECOWAS) Дамціен Чынчыбіджа.»Цяпер у краінах ECOWAS налічваецца 7 млн 337 тыс. вымушана пераселеных асоб з-за канфліктаў, гвалту і стыхійных бедстваў, — прыводзіць яе словы газета The Guardian. — У гэты лік уваходзяць 6 млн 526 тыс. унутрана перамешчаных асоб, а таксама 811 тыс. бежанцаў». Паводле слоў намесніка кіраўніка выканаўчага органа ECOWAS, цяперашняя сітуацыя ў краінах аб'яднання характарызуецца абвастрэннем гуманітарных праблем у сувязі з ваеннымі канфліктамі. Усё гэта вядзе да масавага выхаду насельніцтва, адсутнасці харчовай бяспекі, асабліва ў зоне Сахеля і ў басейне возера Чад. Чынчыбіджа заклікала сусветную супольнасць падтрымаць намаганні кіраўніцтва ECOWAS, якое выдзеліла каля $9 млн на дапамогу бежанцам і асобам без грамадзянства.

### У Францыі і Партугаліі тысячы турыстаў эвакуіраваны з-за лясных пажараў



Лясныя пажары распаўсюджваюцца па ўсёй Еўропе, перадае Euronews. У дэпартаменце Эра на паўднёвым захадзе Францыі загарэлася 350 гектараў сасновага лесу, што вымусіла турыстаў, якія адпачываюць там, эвакуіраваць свае караваны і палаткі ў бяспечныя месцы. Улады заявілі, што пажар быў узяты пад кантроль і ліквідаваны. У Партугаліі жнівень ужо прынёс рэкордную за год шкоду: усяго за два тыдні агонь знішчыў 3,5 тысячы гектараў лесу. На адным з астравоў архіпелага Мадэйра пажар палае на трох франтах. Агонь дасягнуў населеных пунктаў — эвакуіраваны мінімум 160 чалавек. «Вецер у спалучэнні з высокай тэмпературай і нізкай вільготнасцю ўплывае на ўсю стратэгію барацьбы з агнём. Вецер усё ўскладняе», — кажа прэзідэнт рэгіянальнага ўрада Мадэйры Мігел Альбукерке. На дапамогу з мацерыка былі накіраваны дзясяткі пажарных. Францыя і Партугалія прынялі сумную эстафету ў Грэцыі, Албаніі і Італіі, якія пасля некалькіх тыдняў барацьбы ўсё ж змаглі справіцца з полымем.

### Сцёкавыя воды Еўропы сталі палітычнай праблемай

Сцёкавыя воды забруджваюць рэкі і азёры краін Еўропы, і гэта ператварылася ў палітычную праблему. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на агенцтва Bloomberg. Адзначаецца, што праблема забруджвання сцёкавымі водамі ахапіла не толькі



Сену і Тэмзу, але і іншыя буйныя рэкі. Ва ўсёй Еўропе «адходы, якія трапляюць напрамую ў рэкі і азёры, шкодзяць дзікай прыродзе і выклікаюць хваробы ў людзей». У Bloomberg нагадалі, што падчас Алімпійскіх гульняў у Парыжы спартсмены былі вымушаны рызыкаваць сваім здароўем падчас заплыву па забруджанай Сене, а некаторыя з іх нават захварэлі пасля гэтага. Такая сітуацыя прымусіла звярнуць больш пільную ўвагу на «фарміраванне палітычнай праблемы»: старая інфраструктура многіх еўрапейскіх гарадоў не здольная ачысціць вялікую колькасць адходаў прадпрыемстваў і хатніх гаспадарак, і для вырашэння гэтага пытання краінам рэгіёна неабходны комплексны падыход.

Кампетэнтна

# ДАВЕДКА ДА 1 ВЕРАСНЯ — ТОЛЬКІ ПЕРШАКЛАСНІКАМ

**Даведка да 1 верасня патрэбна толькі для першакласнікаў. Для астатніх школьнікаў даведка робіцца адзін раз на год па ўзросце, паведамляе БелТА са спасылкай на намесніка міністра адукацыі Аляксандра КАДЛУБАЯ.**

«Сістэмнай праблемы няма на працягу многіх гадоў, — сказаў Аляксандр Кадлубай. — Медыцынская даведка неабходна 1 верасня, толькі калі дзіця ідзе ў школу ў 1-ы клас. Усе астатнія даведкі прадстаўляюцца ў залежнасці ад даты нараджэння канкрэтнага дзіцяці, дзейнічаючы на працягу каляндарнага года і не патрабуюцца пры пераводзе з аднаго класа ў іншы».

Аляксандр Кадлубай прывёў канкрэтны прыклад. Дапусцім, летась дзіця ішло ў першы клас і даведку яму рабілі, адпаведна, да пачатку навучальнага года для паступлення ва ўстанову адукацыі. Дзень нараджэння ў яго, напрыклад, у кастрычніку ці лістападзе, а гэта значыць, што ў наступныя школьныя гады яно будзе праходзіць медыцынскі агляд і атрымліваць даведку ў кастрычніку—лістападзе.

Разам з тым, нават калі школьнік не прадставіць у дзень нараджэння меддаведку, ніякіх абмежаванняў да яго прымяняцца не будзе, дадаў намеснік міністра.

«Калі ў дзіцяці пры пераводзе з класа ў клас закончваецца медыцынская даведка і яно не прадставіць яе ў той жа дзень ці нават месяц нараджэння, ніхто не будзе прымяняць нейкіх санкцый да гэтага дзіцяці. Яго дапусцяць да ўсіх вучэбных прадметаў, і яно будзе вучыцца са сваім класам», — сказаў Аляксандр Кадлубай.

Паводле яго слоў, бацькі інфармаваны аб штогадовых медыцынскіх аглядах школьнікаў. Педыятры звязваюцца ў тым ліку з медработнікамі ва ўстановах адукацыі і нагадваюць пра гэта. «Нейкага татальнага кантролю пры пераводзе з класа ў клас не ўстаноўлена. Міністэрствы адукацыі і аховы здароўя маюць вопыт супрацоўніцтва і разуменне ў гэтым пытанні», — сказаў намеснік міністра.

Да пачатку навучальнага года Міністэрства адукацыі загадзя разаслала тлумачальныя пісьмы ва ўсе органы кіравання сістэмай адукацыі ў рэгіёнах, каб зняць сацыяльную напружанасць. Намеснік міністра заўважыў, што той ажыятаж, які ствараецца вакол гэтай тэмы, мае спекулятыўны характар і накіраваны на нагнятанне абстаноўкі.

Больш за тое, Міністэрства адукацыі павышанай цікавасці з боку грамадзян, напрыклад павелічэння колькасці званкоў на гарачую лінію па гэтым пытанні, не назірае, падкрэсліў ён.

# «ЗАБАВЫ» НЕ ПА ЎЗРОСЦЕ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Большасць злачынных эпізодаў, звязаных з дзецьмі, адбываецца ў інтэрнэце. Аб найбольш частых з іх падчас прэс-канферэнцыі БелТА расказалі супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў. Праваахоўнікі папярэдзілі аб наступствах, якія чакаюць юных аматараў лёгкіх грошай, а таксама разам з прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі далі парады бацькам: на што звяртаць увагу, каб іх дзеці не трапілі ў поле зроку злачынцаў і, адпаведна, кампетэнтных органаў.

## ЗА 20 РУБЛЁЎ ДА 10 ГАДОЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

Па выніках сямі месяцаў бягучага года, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага, колькасць злачынстваў, здзейсненых падлеткамі, павялічылася: з 670 да 763. Рост адбыўся за кошт злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам сродкаў плацяжу і (або) інструментаў (з 23 да 119 злачынстваў) і незаконным абаротам наркотыкаў (з 35 да 70 злачынстваў). Амаль чацвёртая частка ўсіх злачынстваў здзейснена падлеткамі ў інтэрнэце або з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій. Гэта такія кіберзлачынствы, як незаконны абарот сродкаў плацяжу і (або) інструментаў, махлярства, загадзя ілжывае паведамленне аб небяспецы, несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, знішчэнне, блакіраванне, мадыфікацыя камп'ютарнай інфармацыі. Практычна ўсе злачынствы ў сферы незаконнага абароту наркотыкаў таксама здзяйсняюцца з выкарыстаннем інтэрнэту.

Як звяртае ўвагу **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Аляксандр БЛІЗНЮК**, калі яшчэ некалькі гадоў таму большую частку злачынстваў складалі крадзяжы, то сёння кіберзлачынстваў здзяйсняецца практычна столькі, колькі крадзяжоў. «Мы бачым, што звычайныя злачынствы паступова перацякаюць у віртуальную прастору», — адзначае ён.

Не выключэннем з'яўляюцца махлярствы. Як правіла, апошнія здзяйсняюцца на гандлёвых анлайн-пляцоўках, дзе размяшчаюцца аб'явы аб продажы па яўна заніжаным кошце пэўных брэндавых рэчаў, мабільных тэлефонаў, электронных парагенератараў, якія цяпер вельмі папулярныя сярод падлеткаў. Што павінна насцярожыць? Абавязковай умовай заяўляецца перадаплата або пэўны задатак. Пасля пераводу грошай прадавец, натуральна, перастае выходзіць на сувязь, выдаляе свой акаўнт і проста знікае.

Мяркуецца, што колькасць падобных злачынстваў зменшыцца. Па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў унесены змяненні ў Грамадзянскі кодэкс, згодна з якімі непаўналетні з 14 гадоў будзе мець права адкрываць рахункі ў банках толькі з базавымі ўмовамі абслугоўвання — гэта значыць, для атрымання пенсіі, стыпендыі. Дагэтуль непаўналетнія мелі права з 14 гадоў самастойна, без згоды бацькоў, адкрываць рахункі ў банках і распараджацца імі ў адпаведнасці з заканадаўствам. Гэтым злачынцы і карысталіся.

Вялікая колькасць злачынстваў, фігурантамі якіх з'яўляюцца непаўналетнія, звязана з незаконным абаротам плацежных інструментаў. Іх колькасць вырасла больш як у пяць разоў. «Падлетак ад равеснікаў у сацыяльнай сетцы даведваецца аб магчымасці хуткага і лёгкага заробку шляхам продажу сваёй банкаўскай плацежнай карткі або аўтэнтыфікацыйных даных, або рэквізітаў, — расказвае аб механізме злачыннай схемы Аляксандр Блізнюк. — Звяртаецца ў банкаўскае аддзяленне, афармляе плацежную картку, пасля чаго за грошы прадае гэтыя рэквізіты трэцяй асобе. У далейшым гэтыя плацежныя карткі або доступ да рахункаў выкарыстоўваюцца для таго, каб выводзіць грошы, здабытыя злачынным шляхам».

У сярэднім за продаж адной банкаўскай карткі непаўналетні атрымлівае каля 20 рублёў. Між тым максімальная санкцыя, якая прадугледжвае пакаранне за такі від злачыннасці, — да 10 гадоў пазбаўлення волі. Напрыклад, сёлета была ўзбуджана крымінальная справа на навучэнца Магілёўскага дзяржаўнага эканамічнага каледжа, які за матэрыяльнае ўзнагароджанне прадаў шэсць банкаўскіх картак і зарабіў 50 беларускіх рублёў. Узнікае пытанне: ці варта гэта таго, каб рызыкаваць уласнай свабодай?!

**«Вялікая колькасць злачынстваў, фігурантамі якіх з'яўляюцца непаўналетнія, звязана з незаконным абаротам плацежных інструментаў. Іх колькасць вырасла больш як у пяць разоў. «Падлетак ад равеснікаў у сацыяльнай сетцы даведваецца аб магчымасці хуткага і лёгкага заробку шляхам продажу сваёй банкаўскай плацежнай карткі або аўтэнтыфікацыйных даных, або рэквізітаў».**



Фота з адкрытых крыніц.

## АДКАЗНАСЦЬ ЗА СУПРАЦЬПРАЎНЫЯ ДЗЕЯННІ ДЗЯЦЕЙ — НА БАЦЬКАХ

Вялікая колькасць вольнага часу і адсутнасць кантролю з боку дарослых — тое, чым карыстаюцца злачынцы, уцягваючы непаўналетніх у супрацьпраўную дзейнасць. Невыпадкова супрацоўнікі органаў унутраных спраў сумесна з Міністэрствам адукацыі ўдзяляюць вялікую ўвагу арганізацыі занятасці дзяцей (асабліва падчас летніх канікул), прафілактычнай рабоце. Аднак гэтага недастаткова, каб данесці да маладога пакалення ўсю небяспеку таго, што нясуць за сабой прапановы аб лёгкім заробку. А таму міліцыянеры рэгулярна праводзяць сустрэчы ў працоўных калектывах, каб напрамую з бацькамі пагаварыць аб пагрозах, якія існуюць у маладзёжным асяроддзі.

Па словах начальніка аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх МУС, у першую чаргу бацькі павінны растлумачыць сваім дзецям правілы паводзін у інтэрнэце і папярэдзіць аб небяспеках, якія могуць іх там чакаць. «Чым раней пачаць прывіваць навыкі бяспечнага ўзаемадзеяння з віртуальным асяроддзем, тым больш трывала яны засвояцца, — лічыць Аляксандр Блізнюк. — Менавіта на бацьках ляжыць адказнасць за ўчыненне супрацьпраўных дзеянняў іх дзецьмі, бо яны павінны сачыць за тым, што падлеткі робяць у віртуальнай прасторы. У краіне таксама прадугледжана адказнасць за невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей».

Пры гэтым, як звяртаюць увагу ў міліцэйскім ведамстве, татальны кантроль можа прывесці да таго, што дзіця замкнецца, і прасачыць яго паводзіны ў інтэрнэце будзе складана. У такім выпадку добрай дапамогай у плане кантролю за дзеяннямі дзяцей у інтэрнэце з'яўляецца праграма бацькоўскага кантролю, якую можна ўсталяваць як на тэлефон, так і на ноўтбук або камп'ютар. Праграма дазваляе не толькі бачыць, якія сайты наведвае ваша дзіця, але і абмяжоўваць доступ да іх, кантраляваць колькасць часу, праведзенага ў тэлефоне або за камп'ютарам. Аднак ніякія праграмы кантролю не заменяць даверлівыя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі. Калі нашчадкі вам давяраюць, значна лягчэй не дапусціць бяды.

## ХТО СТАІЦЬ ЗА ВІРТУАЛЬНЫМ СЯБРАМ?

Па выніках сямі месяцаў канстатуецца, што кожнае трэцяе злачынства, якое рэгіструецца ў краіне, здзяйсняецца па лініі кіберзлачыннасці. Маладыя людзі з'яўляюцца як суб'ектамі злачынстваў (прымаюць непасрэдны ўдзел у здзяйсненні супрацьпраўных дзеянняў), так і аб'ектамі (становяцца ахвярамі злачынстваў з прычыны свайго ўзросту і няведання пэўных сітуацый).

«Многія дзеці абыходзяцца з камп'ютарамі і смартфонамі лепш за бацькоў, пры гэтым яны, спрабуючы ўразіць аднагодкаў і паказаць свае найлепшыя якасці, не задумваюцца, якую інфармацыю пакідаюць у сетцы, — заўважае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Аляксей НОВАШ**. — У інтэрнэце можна знайсці іх установачныя даныя, год нараджэння, месца жыхарства, інфармацыю аб бацьках, фота і відэа. У апошніх часам паказаны паводзіны, якія мяжуюць з парушэннем закона. З-за невыканання правілаў лічбавай гігіены гэтая інфармацыя становіцца здабыткам зламыснікаў, якія выкарыстоўваюць яе ў адносінах непаўналетніх».

Акрамя таго, дзеці часта становяцца ўдзельнікамі розных сеткавых гульняў і камунікуюць «анлайн». Пры такіх зносінах, як падкрэсліваюць праваахоўнікі, нельга быць упэўненым, што суразмоўца насамрэч будзе тым, кім сябе пазіцыянуе. За віртуальнымі сябрамі могуць стаяць асобы з сексуальнымі адхіленнямі, людзі, здольныя схіліць моладзь да распаўсюджвання наркотыкаў, уцягнуць у іншую супрацьпраўную дзейнасць, звязаную з набыццём і распаўсюджваннем банкаўскіх картак, іх рэквізітаў, абанецкіх нумароў, сім-карт.

## «ЗАМІНІРАВАЦЬ» ШКОЛУ — І АТРЫМАЦЬ РЭАЛЬНЫ ТЭРМІН

Па словах Аляксея Новаша, адной з галоўных прычын, чаму моладзь становіцца суб'ектам злачынстваў, з'яўляецца імкненне да фінансавай самастойнасці і незалежнасці ад бацькоў. «Пры гэтым дзеці хочуць атрымаць новы тэлефон або моднае адзенне хутка і без асаблівых фізічных намаганняў, — удакладняе ён. — А бацькі дазваляюць ім праводзіць шмат часу ў сецыве і часта не звяртаюць увагі на негатыўны бок віртуальнага свету».

У выніку непаўналетнія ўцягнуты ў злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам сродкаў плацяжу. На першы погляд, гэтыя злачынствы здаюцца не такімі сур'ёзнымі, але, па вялікім рахунку, збыт рэквізітаў і аўтэнтыфікацыйных звестак — пачатковая стадыя ўдзелу ў махлярскіх схемах, звязаных з крадзяжом грашовых сродкаў у грамадзян. У такіх схемах, як правіла, задзейнічана арганізаваная група са строгім размеркаваннем роляў, што прыводзіць да павышанай крымінальнай адказнасці: ад шасці-сямі гадоў пазбаўлення волі.

Рэгулярна злачынцы прыцягваюць непаўналетніх да здзяйснення загадзя ілжывых паведамленняў аб небяспецы: паведамленняў аб мініраванні школы або дзіцячага садка ад імя свайго былога сябра, калегі, суразмоўцы ў інтэрнэце. Такое паведамленне вядзе да спынення дзейнасці арганізацыі, выкліку спецслужбаў, парушэння функцыянавання прадпрыемства, да пэўных эканамічных наступстваў у выглядзе спынення прадпрыемства і ўпушчанай выгады.

«За такія свавольствы, як і за крадзеж шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі, крымінальная адказнасць надыходзіць не з 16, а з 14 гадоў, — адзначае намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС. — Калі асоба не дасягнула ўзросту прыцягнення да крымінальнай адказнасці, то ўся адказнасць будзе класціся на бацькоў».

Займаюцца непаўналетнія і вымагальніцтвам у інтэрнэце. Звычайна запытваюцца пэўныя грашовыя сумы ў абмен на інфармацыю, якую чалавек хацеў бы захаваць у таямніцы (напрыклад, інтымныя фотаздымкі або перапіскі). За такога роду «забавы» таксама прадугледжана крымінальная адказнасць.

## КАНТРАЛЯВАЦЬ САЦСЕТКІ І ЗВЯРТАЦЬ УВАГУ НА ЛІШНІЯ ГРОШЫ

На што звяртаць увагу бацькам, каб іх дзіця не парушыла заканадаўства? Па-першае, дарослых павінна насцярожыць наяўнасць у падлеткаў грошай, паходжанне якіх яны не могуць патлумачыць. Па-другое, варта западозрыць нешта нядобрае і тады, калі ў вашага дзіцяці з'яўляюцца дарагія рэчы (мабільны тэлефон, навушнікі, камп'ютар, адзенне), якія вы яму не набывалі. Па-трэцяе, праявы няшчырасці ў адносінах да вас, яўная хлусня і рэзкія змены ў паводзінах дзіцяці — вось прычыны, па якіх дарослыя павінны забіць трывогу.

Па словах **загадчыцы сектара каардынацыі і метадычнага забеспячэння прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў сярод навучэнцаў Цэнтра сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Акадэміі адукацыі Маргарыты ТОЎКЕС**, бацькам трэба быць уважлівым да таго, з кім мае зносіны падлетак, знаходзячыся ў сацыяльных сетках. «Трэба разумець, чым занятыя дзеці ў інтэрнэце, — кажа яна. — Спецыялісты раяць вывучаць перапіску ў сацыяльных сетках, звяртаць увагу на ўстаноўленыя дадаткі, праграмы на камп'ютары або тэлефоне. Часта здараецца так, што бацькі, імкнучыся засцерагчы сваё дзіця, нават не падазраюць аб тым, што яно становіцца ўцягнутым у злачынныя схемы».

Неабходна гаварыць з дзецьмі аб тым, якія злачынныя схемы існуюць у інтэрнэце. Лічыцца, што, чым раней бацькі пачнуць абмяркоўваць гэтыя пытанні з дзецьмі, тым лепш, бо, як паказвае статыстыка, прапановы аб злачынным «працаўладкаванні» паступаюць да іх у 14-гадовым, 15-гадовым і 16-гадовым узростах.

«Неабходна вучыць дзяцей аналізаваць любыя «прывабныя» аб'явы на адэкватнасць, заўсёды правяраць інфармацыю аб працадаўцы, пераверыўшы, настойваць на афармленні афіцыйных працоўных адносін, — рэкамендуе Маргарыта Тоўкес. — Калі размова не ідзе ні пра што незаконнае, работадаўца павінен пагадзіцца. Важна высвятляць умовы падпрацоўкі да дробязяў, а таксама звяртаць увагу на прапановы зрабіць нешта ананімна. Гэта адзін з маркераў таго, што вас уцягваюць у махлярскую схему».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПРАЦА, ПЕРШАЯ Ў ЖЫЦЦІ

## ПАДЛЕТКАМ МОЖНА...

— Часовую працоўную занятасць моладзі мы арганізоўваем па двух кірунках: шляхам садзейнічання органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў працаўладкаванні на свабодныя рабочыя месцы і праз удзел моладзі ў студэнцкіх атрадах.

Аказанне садзейнічання ў працаўладкаванні органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ажыццяўляецца як з фінансавай дзяржаўнай падтрымкай, так і за кошт сродкаў наймальнікаў. З маладымі грамадзянамі, накіраванымі для часовага працаўладкавання, наймальнікі заключаюць тэрміновыя працоўныя дагаворы. І, такім чынам, на іх распаўсюджваюцца нормы Працоўнага кодэкса і заканадаўства аб ахове працы.

Хачу звярнуць увагу, што для падлеткаў устаноўлена скарочаная працягласць рабочага часу: для работнікаў ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў — 4 гадзіны 36 хвілін, ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў — сем гадзін. Для вучняў агульнаадукацыйных устаноў і ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якія працуюць у вольны ад вучобы час на працягу навучальнага года, за выключэннем канікулаў, ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў — 2 гадзіны 18 хвілін, ва ўзросце ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў — 3 гадзіны 30 хвілін. Аднак, згодна з Працоўным кодэксам, нягледзячы на скарочаную працягласць рабочага часу, непаўналетнім работнікам заработная плата выплачваецца ў такім жа памеры, як работнікам адпаведных катэгорый пры поўнай працягласці штодзённай работы. Пачынаць сваю працоўную дзейнасць моладзі дапускаецца ў 14 гадоў. У такім выпадку працоўны дагавор можа быць заключаны для выканання выключна лёгкай працы, якая не прычыняе шкоды здароўю і не парушае працэс навучання, і, падкрэслю, толькі з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў.

***— Лёгкая праца — гэта якая?***

— Існуе Пералік лёгкіх відаў работ для асоб ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў, які зацверджаны пастановай Мінпрацы ад 15 кастрычніка 2010 г. № 144. Дакумент цяпер дапоўнены і змяшчае 17 пазіцый (раней было 11). Пералічу некаторыя: узважванне на вагах, камплектаванне, сартаванне і ўпакоўка тавараў, выкладка іх на паліцы і ўстаноўка цэннікаў. Сюды ж уваходзяць сервіроўка сталоў і збор брудната посуду ў аб'ектах грамадскага харчавання. Ёсць работа і для юных аматараў жывёл — прыборка клетак, вальераў, загонаў, дапаможных памяшканняў і гнездавых домікаў, мыццё кармушак і паілак. У спіс таксама ўваходзіць ручная мыйка аўтамабіляў і гэтак далей.

## АДВАЖВАЙЦЕСЯ, ВАМ ДАПАМОГУЦЬ!

***— Якім чынам ажыццяўляецца дзяржаўная падтрымка? У чым яе сутнасць?***

— Часовая працоўная занятасць моладзі з фінансавай падтрымкай дзяржавы арганізоўваецца на падставе заключаных паміж органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і наймальнікамі дагавораў.

Органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне фінансуюцца са сродкаў бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва расходы бюджэтных арганізацый і арганізацый, маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай або камунальнай уласнасці, на аплату працы маладых грамадзян у памеры налічанай заработнай платы (з улікам стымуляцыйных і кампенсацыйных выплат) за фактычна адпрацаваны час і выкананую работу, але не больш за памер мінімальнай заработнай платы.

Таксама наймальнікам могуць кампенсавацца затраты на набыццё інструментаў і матэрыялаў, спецадзення, інвентару,



неабходных для правядзення работ, але не больш як 50 працэнтаў затрат згодна з каштарысам расходаў па кожнай дамове аб арганізацыі і фінансаванні часовай працоўнай занятасці моладзі. Дарэчы, па гэтай лініі, з падтрымкай дзяржавы, за чэрвень — ліпень было працаўладкавана больш за 28 тысяч маладых людзей. Усяго ж з пачатку года працаўладкавана больш за 38 тысяч чалавек, з іх 32,5 тысячы — непаўналетнія. Асвоена 6,3 мільёна рублёў дзяржпадтрымкі. Як бачым, асноўнае працаўладкаванне моладзі прыпадае на летні канікулярны перыяд.

***— Якія яшчэ траекторыі працаўладкавання падлеткаў існуюць у краіне?***

— Каб разнастаіць варыянты, у нас існуе практыка арганізацыі апытанняў патэнцыяльных наймальнікаў. На іх падставе фарміруюцца пералікі арганізацый, якія разглядаюць школьнікаў, навучэнцаў і студэнтаў для часовага працаўладкавання без фінансавай падтрымкі дзяржавы. У дадзеным выпадку наймальнікі за кошт уласных сродкаў ажыццяўляюць аплату працы моладзі. Пералікі такіх арганізацый і вакансій, куды можа часова працаўладкавацца моладзь, размешчаны на партале дзяржаўнай службы занятасці (gsz.gov.by), для непаўналетніх ёсць асобная ўкладка. Такіх пазіцый, а яны распісаны па абласцях, у Беларусі каля 8 тысяч у больш чым 2,5 тысячы арганізацый. У асноўным гэта некваліфікаваная праца. Але выбар, як відаць, вялікі.

## СТРОГА ПА СПІСЕ

***— Ці існуе пералік работ з месцамі, дзе падлеткам можна працаваць, а дзе — не?***

— Вядома, ёсць спіс работ, на якіх забараняецца праца асоб, маладзейшых за васямнаццаць гадоў, які зацверджаны пастановай Мінпрацы ад 27.06.2013 № 67. І ён вельмі вялікі. Толькі работ, якія выконваюцца незалежна ад віду эканамічнай дзейнасці, 86 пунктаў. Напрыклад, непаўналетнім забаронена працаваць у начных клубах і казіно, нельга займацца працай, якая прадугледжвае матэрыяльную адказнасць. Многія лічаць, што прадаваць марожанае з латка ці квас на разліў — якраз работа для школьнікаў. І сапраўды, нічога складанага ў ёй няма. Аднак яна ўваходзіць у пералік забароненых, бо звязана з матэрыяльнай адказнасцю. У гандлі, магазіне, можна, напрыклад, ажыццяўляць выкладку тавараў. Зразумела, што на шкоднай вытворчасці школьнікам таксама працаваць нельга.

***— Наколькі арганізацыі гатовы сёння часова працаўладкоўваць падлеткаў? Гэта ж вялікая адказнасць, калі работнікамі становяцца маладыя і непрактыкаваныя — па сутнасці дзеці.***

— Практыка паказвае, што наймальнікі імкнуцца браць на работу моладзь, якой ужо споўнілася 18 гадоў, таму што меней абмежаванняў, у тым ліку і па відах работ. Ну і галоўная прычына — бяспека. Няважна, колькі яны там зробяць, колькі заробяць — для любога наймальніка важна, каб такія работнікі жывымі і здаровымі вярнуліся дадому.

***— Нейкія асаблівыя патрабаванні па ахове працы ёсць?***

— Асноўныя моманты пры працаўладкаванні непаўналетніх я ўжо агучыў у частцы працягласці рабочай змены, відаў работ. Існуюць таксама гранічныя нормы ўздыму і перамяшчэння непаўналетнімі цяжару ўручную, якія зацверджаны пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 13.10.2010 № 134. У астатнім пытанні аховы працы такія ж, як і для дарослых. Вядома, наймальнік прызначае адказнага з дасведчаных спецыялістаў, які кантралюе падлеткаў, у частцы бяспекі — таксама.

## З АДУКАЦЫЯЙ, АЛЕ БЕЗ ДОСВЕДУ

***— Наступнае пытанне не зусім па тэме нашай размовы, але яно таксама датычыцца працаўладкавання моладзі. Якім чынам вырашаецца задача з першым працоўным месцам выпускнікоў ВНУ, якія вучыліся на платнай аснове? Бо першае патрабаванне, што ставіць наймальнік, — досвед, якога ў іх няма. Ці прадугледжана для такіх саіскальнікаў якая-небудзь падтрымка?***

— Наша прафесійная сфера — гэта беспрацоўныя. Таму выпускніку-платніку найперш трэба прыйсці ў службу занятасці і ў абавязковым парадку прадставіць дакумент аб самастойным размеркаванні. Мы ставім яго на ўлік як беспрацоўнага. Хачу папярэдзіць тых, хто спрабуе самастойна працаўладкавацца, маючы абавязковае размеркаванне, — такіх выпускнікоў ВНУ мы на ўлік ніколі не паставім, яны павінны працаваць толькі па размеркаванні. А вось для некаторых катэгорый грамадзян, якія не здольны на роўных умовах канкураваць на рынку працы, ёсць пэўныя дадатковыя гарантыі. У тым ліку і бронь працоўнага месца. Напрыклад, для тых, хто ўпершыню шукае работу ва ўзросце да 21 года.

***— Што гэта за бронь?***

— Не пазней за 1 снежня бягучага года гар-, райвыканкамы прымаюць рашэнні аб устанаўленні на наступны каляндарны год броні для прыёму на работу грамадзян, якія асабліва маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне. Гэта значыць арганізацыям даводзяцца катэгорыі грамадзян, якіх яны павінны прыняць на работу, і іх колькасць. Напрыклад, двух інвалідаў, аднаго вызваленага з месцаў пазбаўлення волі, трох тых, хто ўпершыню шукае работу, і гэтак далей.

Іншымі словамі бронь — гэта мінімальная колькасць працоўных месцаў для працаўладкавання беспрацоўных з ліку катэгорый грамадзян, якія не здольныя на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы і якіх наймальнікі абавязаны прымаць па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на свабодныя месцы.

Як бачым, бронь прадугледжана толькі на вакантныя месцы. Няма вакансій — няма і броні. Калі з'яўляецца пэўная вакансія — чалавека за кошт броні можна туды ўладкоўваць. Служба занятасці дае накіраванне, і саіскальніка ў першачарговым парадку бяруць на работу. Існуе адміністрацыйная адказнасць для наймальнікаў у выпадку неабгрунтаванай адмовы ў прыёме на работу грамадзяніна, які асабліва мае патрэбу ў сацыяльнай абароне.

Ёсць у нас і такі кірунак, як працаўладкаванне беспрацоўных для набыцця вопыту практычнай работы па атрыманай прафесіі, спецыяльнасці, кваліфікацыі з частковай кампенсацыяй наймальнікам затрат на аплату працы. Дапусцім, той жа выпускнік-платнік нідзе не можа працаўладкавацца па атрыманай спецыяльнасці з-за таго, што адсутнічае вопыт і на рынку працы ён малаканкурэнтны. Служба занятасці падбірае вакансію, праводзіць перагаворы з наймальнікам аб магчымасці працаўладкавання такога беспрацоўнага. Пры згодзе наймальніка орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне заключае з ім дагавор аб працаўладкаванні для набыцця вопыту практычнай работы па атрыманай спецыяльнасці з частковай кампенсацыяй затрат па аплаце працы.

Працягласць такога вытворчага трэнінгу — ад двух да шасці месяцаў. Увесь гэты час служба занятасці са сродкаў фонду сацабароны кампенсуе наймальніку затраты на заработную плату такому работніку і налічэнні на яе, але не больш за памер мінімальнай заработнай платы. Адначасова за «практыкантам» замацоўваецца спецыяліст. Пасля навучання і набыцця пэўнага досведу наймальнік па сваім меркаванні можа або адправіць маладога спецыяліста на далейшыя пошукі, або заключыць з ім дагавор і прыняць на пастаянную работу.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чалавек — чалавеку

# Вам, старым, абы паплакаць, абы недзе сырасць развесці

**Кажуць, малодшы павінен тэлефанаваць старэйшаму, начальнік — падначаленаму, здаровы — хвораму...
Але ж часам гэтыя завядзёнкі парушаюцца. Сваёй стрыечнай сястры Наталлі найчасцей тэлефаную я. Яна мне — хіба гады ў рады: заўсёды пытаюся, ці не воўк недзе здох, ці не дуб дзесьці рухнуў?
У той раз па ўсім выглядала, што сястра з яго рухнула сама.**

Калі па парадку, то некалі ў двухпакаёвай хрушчоўцы яна жыла з дачкой, потым з'явіўся зяць і любімы ўнучак Вадзік. Наталля якраз выйшла на пенсію і гадавала яго, аж пакуль маладая сям'я не купіла сабе кватэру, не пераехала ў іншы канец горада. Жыць сталі паасобку і, вядома ж, не горш. Ва ўсякім разе Наталля засталася ў сваім доме, са сваімі суседзямі, крамамі і аптэкамі, са сваёй лавачкай ля пад'езда. Дачка з сям'ёй магла прыязджаць... Праўда, рабіла гэта ўсё радзей і радзей. Па тэлефоне расказвала, што Вадзік ходзіць у школу, займаецца ў розных секцыях, любіць футбол, што зусім не мае часу, каб прыязджаць да бабулі.

Але ж вось, нарэшце, ён, 13-гадовы, пераступіў парог кватэры, сказаў:

— Ба, фізкульт! Як ты тут? Яшчэ ціўкаеш?

Не сцяміўшы, што адказаць, гаспадыня запрасіла госця ў кухню, стала заварваць гарбату, частаваць піражкамі ды распытваць, дзе мама з татам? Добра ж было б, каб усе разам прыехалі?

— Мутэр на фазэнду зліняла. Будзе цэлы дзень там гарбаціцца... А фатэр сёння бабло ссякае...

Бабуля, задраўшы галаву, глядзела на любімага ўнука і вушам не верыла:

— Пачні спачатку, — папрасіла Вадзіма. — І, калі ласка, без «бабла»: так, каб я зразумела.

— А што разумець? Нічога ж складанага! — стаў тлумачыць падлетак. — Мама паехала на дачу і будзе там аж да вечара, у таты на рабоце нейкі тэрміновы заказ. Аплата, сказалі, у двайным памеры... Цяпер ты «ўехала»?

— Уехаць то ўехала, — уздыхнула гаспадыня, — але ж нашы класікі — Пушкін, Купала, Колас — пачуўшы цябе, далібог бы заплакалі...

— А вам, старым, абы слёзы пусціць, абы недзе сырасць развесці, — паспрабаваў адмахнуцца ўнук.

Ды не на тую нарваўся: бабуля — апантаная кнігалюбка, былая настаўніца рускай мовы і літаратуры — не ўтрымалася, распачала маналог на тэму культуры ўвогуле і мовы ў прыватнасці. Мо з гадзіну расказвала ўнуку пра мілагучнасць і прыгажосць нашай «першай дзяржаўнай», пра багацце і непаўторнасць «другой». Хлопчык слухаў яе, і спачатку — досыць уважліва, потым — стаў пазяхаць, а ўрэшце сказаў:

— Ба, не гані пургу. Давай лепш у бой маркі пагуляем. У мяне планшэт з сабой. Я цябе навучу. Табе спадабаецца — прышпільная гульня!

...З бабулі, на жаль, гульца не атрымалася: падскочыў ціск.

З ім, досыць высокім, яна тады набрала мой нумар тэлефона, перадала размову з унукам, прыгразіла:

— Хай толькі з'явіцца дачка, — я ёй выдам! Скажу, што хлопец адбіваецца ад рук, што яны з мужам дрэнна яго выхоўваюць, што нармальныя дзеці ў нармальных сем'ях так не размаўляюць, што з гэтым трэба нешта рабіць, прычым тэрмінова...

Адзінае — ШТО (канкрэтна), мы з сястрой пакуль не прыдумалі.

**Н. Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

Вопыт

# ЛЕТА ДОБРАЕ З КНІГАЙ



**Канікулы, летнія пагодныя дні дзеці з задавальненнем праводзяць на гульнявых пляцоўках. Дык чаму б не скарыстаць іх для праводзення выхаваўча-асветніцкіх і забаўляльных мерапрыемстваў? З такой вось мэтай наша раённая бібліятэка распачала вулічную акцыю «Кніга разам з дзетварой на пляцоўцы гульнявой».**

Даспадобы юным жыхарам райцэнтра прыйшоўся і выязны чытай-дворык з паходным тэатрыкам «Жывая кніга».

Чытаць — і класікаў дзіцячай літаратуры, і сучасных пісьменнікаў — на свежым паветры, разам з іншымі дзецьмі цікава і весела. Культурны дэсант бібліятэкі высаджваўся ў дварах шматпавярховікаў па вуліцы Рамановіч, Кастрычніцкай, Перамогі, на пляцоўцы каля возера.

Інтэрактыўныя арт-паказы «Кніжка выйшла пагуляць» праходзілі з актыўным удзелам саміх гледачоў, якія маглі паказаць свой артыстызм, паставіць сябе на месца герояў апавяданняў, ацаніць іх учынкі. Рэпертуар паходнага арт-тэатрыка склалі апавяданні Віктара Драгунскага «Падзорная труба», Мікалая Носава «Аўтамабіль», Леаніда Панцялеева «На моры», Міхаіла Зошчанкі «Прыгоды малпы», «Галёшы і марозіва», Рыгора Горына «Вожык»...



Забаўныя кніжныя гісторыі напомнілі дзецям, як паводзіць сябе дома, на вуліцы, на рэчцы, каго лічыць сапраўдным сябрам, як любіць жывёл... Калектыўнае арт-чытанне дазволіла зразумець: лета добрае з кнігай, а з добрай кнігай — і пагатоў! Прыемна чытаць і атрымліваць прызы, разам з іншымі каштаваць яблыкі ўраджаю 2024.

...Дваровыя кніжныя дэсанты нашых бібліятэкараў за два летнія месяцы дазволілі ахапіць звыш сотні юных гараджан (у тым ліку з праблемных сем'яў), дзясяткі маладых бацькоў, бабуль і дзядуль.

**Тамара Кругалевіч,**
*г. Беразіно.*

Перажытае — незабытае

# Каханне — гэта шчасце і пакуты ў адным флаконе...

**...Пасля выпускнога яны — учарашнія школьнікі — доўга не маглі расстацца, разысціся па дамах: размаўлялі, гулялі, спявалі, марылі аб дарослым жыцці і будучай вучобе. Ніна збіралася паступаць у сельскагаспадарчы тэхнікум. Але ўсе гэтыя мары перакрэсліла раніца: назаўтра пачалася вайна.**

Мужчыны і хлопцы пайшлі на фронт, у вёсцы з'явіліся акупанты: і чужыя, і свае. Нахабныя, гарластыя, яны шнырылі па хатах і дварах, забіралі прадукты, жывёлу, рэчы, займалі найлепшыя дамы (людзей выганялі ў пуні альбо проста на вуліцу)...

А неяк восеньскай раніцай сабралі ў акрузе ўсю моладзь, пад дуламі аўтаматаў, пехатой пагналі ў Мінск і далей — у фашысцкую Германію.

Халодныя таварнякі-цяплушкі, страх і жаданне ўцячы: нехта спрабаваў адрываць дошкі ў падлозе вагона і вылузвацца з цягніка на хаду, нехта да крыві раздзіраў рукі і націраў іх соллю (фашысты баяліся любой хваробы). Іншыя несупынна плакалі: развіталіся з жыццём і радзімай...

Невялікі правінцыяльны гарадок на поўдні Германіі сустрэў іх халодным дажджом і моцным, парывістым ветрам... Ён, здавалася, працінаў да касцей, як і позіркі немецкіх «баўэраў». Сабраўшыся на платформе, яны цынічна разглядалі будучую рабсілу, нешта гергеталі, смяяліся, тыркалі пальцамі — выбіралі «тавар».

Ніна з гамяльчанкай Тамарай трапілі ў сям'ю састарэлых фермераў, дзе павінны былі даглядаць жывёлу: статак кароў, дзясяткі свіней, гусей, курэй... Увесь дзень па раскладзе...

Але ж гэтым парабчанкам яшчэ пашчасціла: іх кармілі, ім дзве гадзіны штодня дазвалялі адпачываць. У іх нават быў выхадны.

Чалавек да ўсяго прывыкае. Вось і гэтыя найміткі прывыклі, змірыліся з лёсам: сталі часцей сустракацца з сяброўкамі па няшчасці, цішком спяваць свае песні, нават выходзіць у горад.

Там яны і даведаліся, што непадалёк знаходзіцца лагер для ваеннапалонных, пайшлі паглядзець і як не пахварэлі: за калючым дротам былі сотні замардаваных галодных мужчын.

Дзяўчаты вырашылі прыносіць ім ежу — вараную бульбу і хлеб. Кідалі туды, дзе чулася знаёмая мова. Кідалі здалёк (баяліся вартавых з сабакамі).

Аднойчы да лагера Ніна прыйшла адна. Стаяла, глядзела, чакала зручнага моманту, каб кінуць хлеб, і раптам сустрэла позірк, ад якога зайшлося, здрыганулася сэрца. Быццам адчула: «Мой... Назаўжды».

З таго дня ў кожную свабодную гадзіну дзяўчына старалася прыбегчы да вялікай разгалістай ліпы, з-за якой так добра было назіраць, а часам нават падыходзіць бліжэй да калючага дроту і размаўляць. Яе палоннага звалі Сяргей.

Немец-гаспадар заўважыў адлучкі парабчанкі, высачыў яе, пабіў і на месяц забараніў выходзіць за тэрыторыю двара. Але нават тады Ніна адчувала сябе шчаслівай.

...У красавіку 1945-га прыйшло доўгачаканае вызваленне, і закаханыя нарэшце сустрэліся: планавалі разам паехаць у Беларусь, на Чэрвеньшчыну і больш ніколі не разлучацца. Аднак лёс распарадзіўся інакш. На граніцы Сяргея затрымалі людзі ў ваеннай форме (сказалі, што гэта ненадоўга, для высвятлення асобы)...

Ніна цэлы тыдзень чакала яго на вакзале і ў родную вёску прыехала адна. Зрэшты — не зусім: хутка адчула, што чакае дзіця. І, нягледзячы ні на што, нарадзіла. Назвала, як бацьку — Сяргеем.

...Пра сваё няпростае жыццё гэта жанчына распавядала спакойна. Слёзы толькі зрэдку градам каціліся з вачэй і разам з імі — вершы:

*Хлеба не трэба было і вады.*
*Сэрца агнём палала.*
*Як я кахала яго заўжды!*
*Як я па ім сумавала!*
*Нудна гулі за акном правады.*
*Сцюжа сляды замятала.*
*Як я любіла яго заўжды!*
*Як я яго чакала!*

Вершы і слёзы. Слёзы і вершы. Мы плакалі тады разам. І гаварылі, што каханне — гэта не сінонім шчасця. Гэта шчасце і пакуты ў адным флаконе.

...Сын Сяргей Сяргеевіч вырас дужым і прыгожым. Пасля школы і службы ў войску скончыў так званую «мараходку». Служыў у Прыбалтыцы, стварыў сям'ю. Аднак пасля распаду СССР усё там стала чужым. Сяргей — ужо вельмі хворым — вярнуўся да маці. І, на жаль, не ён яе пахаваў, а яна...

Ніна Аляксандраўна вельмі гаравала тады. Усё часцей скардзілася на сэрца, на хворыя ногі, усё радзей выходзіла з дому. Помню, як першы раз не прыйшла на мітынг, прысвечаны Дню Перамогі. Разам з дзецьмі мы занеслі ёй букецік цюльпанаў і віншавальную паштоўку, трошкі пагаварылі. А на пачатку ліпеня Ніны Аляксандраўны не стала, сышла ў лепшы свет і — я веру — знайшла прытулак на нябёсах — за адно толькі вялікае, святое каханне.

**Наталля Сівак,** *Чэрвеньскі раён.*

Ёсць пытанне

# ВУЧЫСЯ, НЯБОЖА! БАБУЛЯ ПАМОЖА

***Сёлета мая ўнучка скончыла школу, паступіла ва ўніверсітэт, але за вучобу, на жаль, давядзецца плаціць. Прадбачачы гэта, я некалькі гадоў — унучцы, на вучобу — адкладвала грошы і цяпер хацела б іх падарыць. Ці можна дарэнне афарміць праз натарыуса? І ці трэба мае долары і еўра пераводзіць у беларускія рублі?***

**А. Д.,**
*Барысаўскі раён.*

У адпаведнасці з нормамі грамадзянскага заканадаўства натарыяльная форма для дагавора дарэння грошай не патрабуецца, аднак па жаданні бакоў такі дагавор можа быць засведчаны ў натарыуса.

Для гэтага вам разам з унучкай неабходна звярнуцца на прыём да любога натарыуса з дакументамі, якія сведчаць асобу, а калі ў дагаворы вы жадаеце адлюстраваць роднасныя адносіны з той, якую адорваеце, то спатрэбяцца яшчэ і дакументы, якія пацвярджаюць гэты факт (у доказ сваяцтва з унучкай могуць быць прадстаўлены пасведчанні аб нараджэнні, аб заключэнні шлюбу, даведкі, якія змяшчаюць звесткі з запісаў актаў грамадзянскага стану). У выпадку пацвярджэння родных адносін натарыяльны тарыф за пасведчанне дагавора дарэння падлягае аплаце ў меншым памеры.

Сума грошай, якая бязвыплатна перадаецца дарыльшчыкам па дагаворы дарэння, дзейным заканадаўствам не абмежавана і ўказваецца натарыусам са слоў бакоў. Адначасова адзначу, што ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2003 г. № 226-З «Аб валютным рэгуляванні і валютным кантролі» допускаецца дарэнне грошай паміж фізічнымі асобамі і ў замежнай валюце.

Такім чынам, прадметам дарэння можа быць грашовая сума не толькі ў беларускіх рублях.

**Марына Кітаёва,**
**натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

21 жніўня 2024 г. № 31 (764)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

МІЖНАРОДНЫЯ СТАСУНКІ

# ФОРУМ НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Беларускія дэлегаты рыхтуюцца да другога ўзбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму, які 26 і 27 жніўня адбудзецца ў Ташкенце

O'ZBEKISTON-BELARUS
AYOLLARI BIZNES-FORUMI

**Першы такі форум у мінулым годзе паспяхова прайшоў на беларускай зямлі. Жанчыны-прадпрымальніцы дзвюх краін наладзілі масты супрацоўніцтва. Было падпісана 14 мемарандумаў і пагадненняў, уключаючы пагадненне аб стварэнні сумеснай гарбарна-абутковай вытворчасці, заключана 15 кантрактаў на 93,5 мільёна беларускіх рублёў. Прагназуецца, што сёлетні форум стане яшчэ больш эканамічна выгадны.**



Мінск летась прымаў гасцей з Узбекістана з традыцыйнай беларускай гасціннасцю.





### Арганізавана і эфектыўна

Не менш важным з'яўляецца і ўмацаванне міжпарламенцкіх кантактаў — каардынацыяй форуму займаюцца Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Сенат Олій Мажліса Узбекістана. На нарадзе, прысвечанай пытанням правядзення форуму, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** паставіла задачу, каб жаночы бізнес-форум прайшоў на ўзбекскай зямлі арганізавана і меў эканамічны эфект для нашай краіны. «Беларусь і Узбекістан зацікаўлены развіваць супрацоўніцтва, — звярнула ўвагу спікер. — Ім цікавая наша краіна. Нам трэба працаваць, і працаваць эфектыўна».

Наталля Качанава ўзначаліць беларускую дэлегацыю падчас другога жаночага бізнес-форуму. Сярод дэлегатаў — сенатары, жанчыны-прадпрымальніцы, прадстаўнікі гуманітарнай сферы. Плануецца, што ад беларускага боку ў пасяджэннях секцый, пленарным пасяджэнні, выстаўцы возьме ўдзел каля ста чалавек.

У першы дзень пройдзе шэсць тэматычных секцый, якія закранаюць вядучыя кірункі супрацоўніцтва Беларусі і Узбекістана: машынабудаванне, лёгкую прамысловасць, сельскую гаспадарку, хімію і дрэваапрацоўку, медыцынскія і адукацыйныя паслугі, турызм. Асноўная мэта секцыйных пасяджэнняў — дэманстрацыя нашага эканамічнага патэнцыялу, устанаўленне новых кантактаў.

На другі дзень форуму адбудзецца пленарнае пасяджэнне. Яго тэма — «Ад традыцыйнага да «зялёнага» бізнесу». Запланавана правядзенне выстаўкі прадукцыі беларускай вытворчасці. У экспазіцыі прымуць удзел больш за 50 прадпрыемстваў і арганізацый. У рамках форуму будуць падпісаны камерцыйныя кантракты і дакументы аб супрацоўніцтве.

### Эканамічныя магчымасці і ўстанаўленне кантактаў

Удзельніцы другога жаночага беларуска-ўзбекскага форуму падзяліліся сваімі чаканнямі ад будучага мерапрыемства.

Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Марына ІЛЬІНА**, парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь бачыць сваёй задачай прадэманстраваць узбекскім партнёрам эканамічныя магчымасці нашай краіны, зацікавіць ва ўстанаўленні новых кантактаў, унесці канкрэтныя прапановы па супрацоўніцтве ў розных сферах.

«Прадугледжваецца, што будуць разгледжаны пытанні развіцця культурнага і падзейнага турызму, рэалізацыі сумесных праектаў у сферы навукі, адукацыі і культуры. У фокусе ўвагі другога форуму застаюцца пытанні развіцця жаночага прадпрымальніцтва і падтрымкі жаночых бізнес-праектаў у Беларусі і Узбекістане», — удакладніла сенатар.

Па словах Марыны Ільіной, сёння з упэўненасцю можна сказаць, што першы форум выступіў з аб'ядноўчай ініцыятывай жанчын Беларусі і Узбекістана для ўмацавання даверу і партнёрства, абмену перадавым вопытам у сферы рэалізацыі дзяржаўнай гендарнай палітыкі, прававога рэгулявання і пашырэння правоў і магчымасцяў жанчын у сферы эканомікі і прадпрымальніцтва.

«Другі форум адкрые дадатковыя магчымасці для нарошчвання тавараабароту, развіцця эканамічнай кааперацыі паміж беларускімі і ўзбекскімі суб'ектамі гаспадарання, стане пляцоўкай для пашырэння ўзаемадзеяння і пошуку сумесных праектаў і ініцыятыў», — канстатавала член Савета Рэспублікі.

***(Заканчэнне на 9-й стар.)***

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Сустрэчы ў калектывах, маніторынг цэн і спартакіяда

### Насычаны тыдзень членаў Савета Рэспублікі

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл РУСЫ** сустрэўся з працоўным калектывам ААТ «Белсолад» у г. Іванаве Брэсцкай вобласці — адзіным вытворцам у краіне піваварнага соладу.

Парламентарый абмеркаваў у калектыве праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці», які накіраваны на сістэмны перагляд Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў у мэтах дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі крымінальнай адказнасці, узмацнення гуманістычнай накіраванасці крымінальнага закона.

Таксама ў ходзе адкрытага дыялогу былі закрануты розныя аспекты — асноўныя мэты і задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам; выкананне эканамічных паказчыкаў, дадзеных прадпрыемству; дысцыпліна і адказнасць на сваім працоўным месцы; падрыхтоўка дзяцей да новага навучальнага года. Міхаіл Русы гаварыў з людзьмі аб актыўнай пазіцыі кожнага ў паляпшэнні нашага заканадаўства.

***

Адбылася сустрэча **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, галоўнага ўрача Мінскай цэнтральнай раённай клінічнай бальніцы Гарыка БАРСАМЯНА** з працоўным калектывам ААТ «Жодзінскі доследна-эксперыментальны механічны завод «РЭМІЗ».

У час сустрэчы размова ішла аб 30-гадовай гісторыі развіцця інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне. У ходзе абмеркавання парламентарый азнаёміў удзельнікаў са знакавымі дасягненнямі і вехамі ў гісторыі суверэннай Беларусі, эканамічнымі гарантыямі, распрацоўкамі ў тэхналогіі і медыцыне.

Абмеркаваны таксама сучасная геапалітычная абстаноўка, актуальныя пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, якасць і даступнасць медыцынскай дапамогі. Сустрэча праходзіла ў фармаце дыялогу, у работнікаў прадпрыемства была магчымасць задаць сенатару пытанні, якія іх цікавяць.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Конус» РУП «НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі» Андрэй ЖАМОЙДА** прааналізаваў рынак школьнай прадукцыі ў Дзятлаўскім раёне.

«Гандлёвыя прадпрыемствы адгукнуліся на рэкамендацыі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю па зніжэнні гандлёвых надбавак на школьныя тавары і знізілі цэны на іх, зрабіўшы даступнымі для ўсіх катэгорый грамадзян. З іншага боку, акрамя асартыменту, вельмі важна шырокае інфармаванне спажыўцоў аб спецыяльных прапановах — гэта стымулюе пакупніцкі попыт. Плакаты і інфармацыйныя ўлёткі з указаннем акцый і спецыяльных прапаноў ад крам дазваляюць кожнаму пакупніку абраць для сябе найлепшы варыянт», — адзначыў парламентарый.

***

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН** прыняў удзел у абласной летняй спартакіядзе дэпутацкага корпуса Магілёўскай вобласці ў Асіповічах.

Спаборніцтвы прысвечаны 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Член Савета Рэспублікі, галоўны суддзя спартакіяды Аляксандр Гарошкін даў афіцыйны старт спаборніцтвам, а таксама пажадаў усім удзельнікам яркіх дзён спаборніцтваў, сумленных перамог і плённых жывых зносін.

Пазмагацца за правы называцца самымі актыўнымі і спартыўнымі прыехалі 24 зборныя, якія прадстаўляюць усе раёны рэгіёна, а таксама асобна з Магілёва, Бабруйска і Магілёўскай вобласці.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «Рабіць так, каб людзям было добра, зручна і камфортна»

## Наталля ЯКУБІЦКАЯ правяла асабісты прыём грамадзян

**На мінулым тыдні член Савета Рэспублікі Наталля Якубіцкая правяла асабісты прыём грамадзян. Гэтым разам яна наведала горад-спадарожнік Смалявічы. На працягу некалькіх гадзін Наталля Віктараўна выслухоўвала наведвальнікаў, імкнулася вырашыць кожную праблему, ставіла на асабісты кантроль тыя пытанні, якія сёння хвалююць жыхароў Міншчыны. Такія прыёмы дазваляюць людзям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, вырашыць сваю праблему ці, як мінімум, атрымаць каштоўную параду. Прадстаўнікам улады падобныя мерапрыемствы дазваляюць убачыць, дзе ў заканадаўстве ці іншых нарматыўна-прававых актах ёсць недахопы і на што трэба звярнуць пільную ўвагу.**

### Аўтобусаў мала, транзіту шмат...

Гэтым разам на сустрэчу з дэпутатам прыйшлі дваццаць чалавек з Мінскага, Смалявіцкага і Чэрвеньскага раёнаў. З пытаннем аб арганізацыі дадатковых рэйсаў пасажырскіх аўтобусаў у ранішні і вячэрні час звярнулася **жыхарка пасёлка Усяж Смалявіцкага раёна.** Было прапанавана правесці маніторынг загружанасці. Дата прызначана на 1 верасня. 2 верасня неабходна даць справаздачу аб выніках маніторынгу.

**Сяргей Фёдаравіч з вёскі Валяр'янава Мінскага раёна** звярнуўся з пытаннем аб павелічэнні трафіку на вуліцы Армейскай пасля таго, як там праклалі новае асфальтаванае пакрыццё. Грамадзяне просяць абмежаваць транзіт, бо на вуліцы няма тратуараў і асвятлення, а буйнагабарытныя і легкавы транспарт ходзяць пастаянна: «Пасля таго, як у нас праклалі асфальт, трафік павялічыўся ў некалькі разоў. Гэта аўтамабілі гандлёвых пунктаў, індывідуальныя і грузавыя машыны. Мы звярталіся ў Мінскі райвыканкам. Таксама збіралі калектыўныя подпісы для таго, каб нам абмежавалі транзіт. Дзеці ходзяць у школу і назад дадому па гэтай дарозе. І калі летам з гэтым праблем няма, то зімой дарога ператвараецца ў сапраўдны квэст».

Наталля Якубіцкая прапанавала рашэнне праблемы ў выглядзе перанакіравання руху на аб'язную дарогу з устаноўкай дарожнага знака аб забароне транзіту: «Давайце гэта зробім хутка. Паглядзім, дзе можна зрабіць аб'езд. Мы вывучым гэтае пытанне».

**Шматдзетную маці Таццяну Мікалаеўну з вёскі Карзуны Чэрвеньскага раёна** хвалюе стан вуліцы Мінскай. Яна вузкая і доўгая. Пакрыцця няма. Жанчына паказала фатаграфіі праезнай часткі ў міжсезонне. Перыядычна праходзіць грэйдар, але сітуацыю гэта не ратуе: «Гразь неймаверная. Увесну і ўвосень можна прайсці толькі ў ботах. На гэтай вуліцы знаходзіцца прыпыначны пункт, таму людзі вымушаны ісці па ёй».

**Генеральны дырэктар ЖКГ Мінскай вобласці Юрый КУКАШУК** прапанаваў абмеркаваць пытанне на месцы: «Давайце сустрэнемся з вамі там. Мы прыедзем з намеснікам старшыні выканкама і ацэнім сітуацыю. Асфальт — не панацэя. Часам ён можа пагоршыць сітуацыю. Выедзем ды паглядзім, што можна зрабіць».

«Юрый Уладзіміравіч, я ўскладаю на вас вялікія надзеі! Да нас звярнулася шматдзетная сям'я, шматдзетная маці. Паглядзіце, што там адбываецца», — адначыла Наталля Віктараўна. Яна папрасіла жанчыну трохі падрабязней ахарактарызаваць сітуацыю па населеным пункце з цэлым: «Дзеткі здаровыя? Як справы з гандлем?»

Таццяна Мікалаеўна распавяла, што з гандлем праблем няма, працуюць крамы. Аднак ісуе пытанне з падвозам дзяцей у садок і школу: «Калі ў школу яшчэ з горам папалам дзяцей адвезці можна, то ў дзіцячыя садкі — наогул ніяк, падвозу няма. З-за гэтага дзеці спазняюцца, прачынаюцца раней, чым трэба, недасыпаюць. Дзіцячыя садкі знаходзяцца ў іншых населеных пунктах. Я некалькі гадоў спрабавала змагацца з гэтым, але нічога не зробіш: няма ні аўтобусаў, ні кіроўцаў».

Праблема ўзята на кантроль: «Я вывучу гэтае пытанне, добра, што вы расказалі. Будзем разбірацца», — паабяцала Наталля Якубіцкая.

### Смецце на вуліцы і шыфер, які падае

**Зоя Сцяпанаўна з вёскі Прысынак Пліскага сельсавета Смалявіцкага раёна** ўзняла пытанне агульнага смецця на пляцоўцы каля двухпавярховак. Па словах заяўніцы, яно вывозіцца рэдка і толькі па званку: «Машына па смецце прыязджае рэдка. Завалена ўсё. У нас вельмі шмат маленькіх дзетак, якія гуляюць каля гэтай кантэйнернай пляцоўкі. Там завяліся пацукі, адзін з іх нават пакусаў дзіця. Дзяўчынку тэрмінова даставілі ў медыцынскую ўстанову, дзе ёй зрабілі шмат уколаў».

Праблема і са станам пад'ездаў. У жылым доме — восем кватэр і восем малалетніх дзяцей: «53 гады не рабіўся капітальны рамонт. Дом літаральна развальваецца. Аднаму дзіцяці на галаву ўпаў шыфер, упала цэгла на глуханямую жыхарку дома. Я напісала ліст у ЖЭС за подпісам усіх жыхароў. У маі выпала акно, звярталіся ў ЖЭС, яго аднавілі сваімі сіламі, зашклілі. Давалі заяўку і на дзверы, але адказалі, што іх трэба таксама ставіць сваімі сіламі... Мы пераканаўча просім зрабіць капітальны рамонт...»

«І я прашу пераканаўча! — настаяла на рамонце Наталля Якубіцкая. — Таварышы кіраўнікі, прашу паставіцца да гэтай праблемы максімальна сур'ёзна. Зрабіце ўсё неабходнае, людзям трэба дапамагчы».

Мясцовых жыхароў задаволіў варыянт правядзення кропкавага рамонту. Работы пачнуцца ў гэтым годзе. Пытанне ўзята на кантроль. Юрый Кукашук таксама даручыў перанесці кантэйнерную пляцоўку ў іншае месца і замяніць абсталяванне на кантэйнеры памерам 1,1 кубічных метра замест ранейшых 0,75.

Таксама былі ўзняты пытанні аб вывазе смецця з тых жа двухпавярховак і аб адсутнасці пакосу: «За цэлае лета не была абкошана ні адна падстанцыя. Раней я прасіла аб гэтым людзей, якія маглі касіць. Прыедзьце і паглядзіце самі. За цэлае лета нічога не было зроблена», — запэўніла Зоя Сцяпанаўна.

Сенатар паабяцала выехаць на месца разам са старшынёй сельсавета і службамі, адказнымі за вырашэнне праблем: «Я прашу ўсе службы, каб кожная адпрацавала па сваіх кірунках. Прыбярыце аварыйныя дрэвы, прыедзьце і навядзіце там парадак».

Апошняе пытанне, якое хвалюе пенсіянерку, — работа мясцовай крамы. А дакладней — яе неработа: «У нас у вёсцы вельмі шмат старэнькіх людзей. Раней крама працавала і ўсім было добра: кожны мог купіць тавары першай неабходнасці. Месяц таму звольнілася прадавец, таму краму зачынілі. Да нас прыязджае аўтакрама, але не ўсе паспяваюць да яе дайсці, у нас вельмі шмат хворых. Малако і хлеб трэба ж купляць кожны дзень, а цяпер такой магчымасці няма...»

Наталля Віктараўна падзякавала за змястоўную і інфарматыўную размову: «Усе пытанні будзем здымаць і вырашаць, рабіць так, каб людзям было добра, зручна і камфортна. Дзякуй за давер!»

**Валянціна з аграгарадка Барсукі Смалявіцкага раёна** падзякавала прысутным за тое, што многае ў аграгарадку зроблена да «Дажынак». Яна адзначыла добрую работу барсукоўскага клуба. Але жанчына просіць вярнуць тры «ляжачыя паліцэйскія» па вуліцы Лясной. Кажа, няроўнасці прыбралі, пакінулі толькі знак абмежавання хуткасці, што, на жаль, сітуацыю не ратуе. **Кіраўнік ДРБУ 123 Аляксандр ГАДУН** сказаў, што на працягу наступнага тыдня штучныя няроўнасці вернуць — іх прыбіралі часова ў сувязі з рамонтнымі работамі.





> Шматдзетную маці Таццяну Мікалаеўну з вёскі Карзуны Чэрвеньскага раёна хвалюе стан вуліцы Мінскай. Яна вузкая і доўгая. Пакрыцця няма. Жанчына паказала фатаграфіі праезнай часткі ў міжсезонне. Перыядычна праходзіць грэйдар, але сітуацыю гэта не ратуе: «Гразь неймаверная. Увесну і ўвосень можна прайсці толькі ў ботах. На гэтай вуліцы знаходзіцца прыпыначны пункт, таму людзі вымушаны ісці па ёй».

Таксама жанчына ўзняла пытанне асвятлення вуліцы Цэнтральнай на ўчастку да ФАПа. Старшыня райсавета Савета дэпутатаў Марына Клюева аб праблеме ведае. Пытанне будзе прапрацавана.

### Як дайсці да аўтакрамы і не наехаць на веласіпедыста

Яшчэ адна праблема прагучала ад жыхароў двухпавярховак па вуліцы Камсамольскай, нядаўна абнесеных глухімі агароджамі з металапрофілю. Людзі асцерагаюцца выязджаць з двароў, баючыся наехаць на самакатараў і веласіпедыстаў, якія едуць з горкі, з боку мікрараёна Сад, на высокай хуткасці.

Веладарожкі там няма — яна на процілеглым баку вуліцы. Але дзеці ўвагі не звяртаюць. Забараніць ехаць па гэтым баку ДАІ не можа — няма такіх паўнамоцтваў. Але сітуацыя, якая склалася, пагражае бяспецы руху.

Пытанне перададуць у «Аблдарпраект», які займаўся праектаваннем вуліцы. Праблему будуць вырашаць.

Таксама падчас сустрэчы абмяркоўваліся пытанні стану калодзежаў, добраўпарадкавання тэрыторыі рынку, падтаплення падвалаў у населеных пунктах, рамонту дарог, мадэрнізацыі ліній электраперадач, бяздомных жывёл і іншыя.

**Жыхары Пліскага сельсавета** прыйшлі з праблемай перабояў у электразабеспячэнні. На працягу многіх гадоў яны сутыкаюцца са скачкамі напружання. **Начальнік Смалявіцкіх РЭС Аляксей ПАПКОЎ** растлумачыў, што дэфекты звязаны з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я і вырастаннем расліннасці паблізу ліній электраперадачы. «На дадзены момант прычыны адключэнняў ліквідаваны», — запэўніў Аляксей Міхайлавіч.

**Жыхарка вёскі Палявая** ўзняла пытанне аб наяўнасці прыпынку ў населеным пункце, закрануўшы пытанне якасці дарог, па якіх праблематычна праехаць зімой, і адсутнасці пешаходнага пераходу да дзіцячага садка.

«Мы ўключым вас у план будаўніцтва на будучы год, прыпынак для жыхароў будзе зроблены, як і пешаходны пераход, дарога будзе прыведзена ў парадак», — запэўніла Наталля Якубіцкая.

*Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.*

# ФОРУМ НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 7-й стар.)*

Як звярнула ўвагу **дырэктар ТАА «МНТП» Ульяна АКПЕРАВА,** асноўная мэта форуму — расказаць пра сябе і сваё прадпрыемства, свой бізнес, падзяліцца думкамі, задачамі і вопытам, а таксама пераняць вопыт іншай краіны. «Вельмі цікава даведацца, як ва Узбекістане будуецца прыватны бізнес, з якімі магчымымі цяжкасцямі сутыкаюцца бізнесмены гэтай краіны, — падзялілася яна. — Мне, як кіраўніку прыватнага прадпрыемства, якое займаецца вытворчасцю ізаляцыйных матэрыялаў, хочацца даведацца, ці ёсць аналагічныя вытворцы, якімі матэрыяламі карыстаюцца будаўнікі, чым ізалююць трубаправоды, ці ёсць у іх неабходнасць у новых сучасных матэрыялах».

Удзельніца другога ўзбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму таксама хоча атрымаць адказы на наступныя пытанні: як жанчыны адчуваюць сябе ў бізнесе, ці даводзіцца ім працаваць у рэжыме шматзадачнасці, кіраваць вялікімі калектывамі мужчын, як наладжаны стасункі з органамі кіравання? «Удзел у форуме пасадзейнічае больш эфектыўнаму выбудоўванню двухбаковага супрацоўніцтва, пошуку партнёраў, абмену вопытам работы інфраструктур падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу», — лічыць кіраўнік прыватнага прадпрыемства.

## Абмен вопытам і рэалізацыя культурных ініцыятыў

Па меркаванні **дырэктара КУП «Маладзёжная сацыяльная служба» Алены ПЛІС,** узбекска-беларускі жаночы бізнес-форум з'яўляецца платформай для пошуку дзелавых партнёраў, пашырэння рынкаў збыту і кліенцкай базы. «Гэта падзея, якая садзейнічае развіццю і ўстанаўленню двухбаковых бізнес-кантактаў, — упэўнена яна. — Форум дасць магчымасць вызначыць шляхі ўдасканалення экспартнага і інвестыцыйнага патэнцыялу, персанальна абмеркаваць пытанні супрацоўніцтва



і заключэння кантрактаў з прадстаўнікамі арганізацый — удзельніц мерапрыемства. Вельмі важна пазнаёміцца з досведам працы, сістэмамі і прыладамі падтрымкі прадпрымальніцтва ўзбекскіх калег і падзяліцца з імі сваім досведам».

Алена Пліс паведаміла, што ў наступным годзе плануецца сумесна з партнёрамі з Ташкента правесці бізнес-форум «Ад ідэі да бізнесу», а таксама канферэнцыю «Сакрэты паспяховых прадпрымальнікаў», на якой калегі змогуць падзяліцца гісторыямі сваіх прадпрыемстваў, якія дасягнулі поспеху дзякуючы ведам, талентам, здольнасцям і мэтанакіраванасці кіраўнікоў. «Безумоўна, у кожнага прадпрымальніка ёсць свае сакрэты поспеху, законы паспяховага бізнесу, аднак кожны з іх вылучае агульную формулу, якая вучыць, як аддавацца сваёй справе поўнасцю і рухаць кампанію наперад», — лічыць яна.

З нецярпеннем чакае пачатку работы другога ўзбекска-беларускага жаночага бізнес-форуму **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля КАРЧЭЎСКАЯ.** «Прамыя кантакты прадстаўніц нашай краіны вельмі важныя, — адзначае ўдзельніца мерапрыемства. — Спадзяванні, якія ўскладаю на гэты бізнес-форум, звязаны найперш з актывізацыяй кантактаў як з нашымі даўнімі партнёрамі, з якімі ў нас заключаны дагаворы аб узаемадзеянні, так і з пошукам новых пунктаў судакранання, абмеркаваннем новых магчымых праектаў у сферы культуры і адукацыі, праграм акадэмічнага абмену паміж выкладчыкамі і студэнтамі і рэалізацыяй значных культурных ініцыятыў, паколькі станоўчы вопыт такога ўзаемадзеяння ў нас ужо ёсць. Нашы сустрэчы дазволяць напрамую абмяркоўваць пытанні ўзаемадзеяння паміж моладдзю нашых краін, прафесарска-выкладчыцкім складам».

## Прасоўванне беларускай прадукцыі і сацыяльнае супрацоўніцтва

**Начальнік упраўлення па вытворчасці і рэалізацыі вырабаў з натуральнага футра УП «Гроднакаапфутра» Ірына КОЗЫРАВА** заўважае, што ўдзел у другім узбекска-беларускім форуме стане важным этапам у прасоўванні беларускай футравай прадукцыі на міжнародную пляцоўцы. «Форум збярэ жанчын-лідараў: палітыкаў, прадпрымальнікаў, вучоных, кіраўнікоў грамадскіх арганізацый з Узбекістана і Беларусі, каб падзяліцца карысным вопытам у рэалізацыі праектаў, накіраваных на ўмацаванне эканомікі, будзе садзейнічаць развіццю прафесійных і асабістых кантактаў, стане пляцоўкай для абмену перадавым вопытам у развіцці глабальнага і лічбавага мыслення, ідэй жаночага бізнесу, прымянення сучасных тэхналогій, стварэння рэгіянальных і міжнародных гуманітарных і дзелавых кантактаў», — канстатавала яна.

Па словах Ірыны Козыравай, менавіта цяпер асабліва важную ролю набывае пазітыўная, стваральная і аб'ядноўчая дзейнасць жанчын розных рэгіёнаў і розных краін, і гэта дае вялікую надзею на перспектыўнае супрацоўніцтва. «Беларуская пушніна — гэта спалучэнне традыцый, спадчына з больш чым 60-гадовым вопытам і невычэрпнай энергіяй наватарства, — адзначыла яна. — Беларускі саюз спажывецкіх таварыстваў вядзе планамерную і мэтанакіраваную работу па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы і аснашчэнні ўласнай зверагадоўчай галіны сучасным абсталяваннем. Канцэпцыя вырошчвання толькі перспектыўных відаў пушніны скандынаўскага генатыпу заклікана вывесці беларускую футравую індустрыю на новы, больш высокі ўзровень».

Як адзначае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Людміла САПЕГА,** другі ўзбекска-беларускі жаночы бізнес-форум — гэта не толькі эканамічнае партнёрства, але і сацыяльнае супрацоўніцтва. «Да гэтага форуму ўсе рыхтуюцца грунтоўна — задоўга да яго пачатку вывучаюць прадукцыю вытворцаў Цэнтральнай Азіі, — паведаміла яна. — Кожны накіраваны на новы рынак і новыя кантракты, а яшчэ на прасоўванне нацыянальных інтарэсаў, бо жаночы форум — гэта не толькі эканамічнае партнёрства, але і сацыяльнае супрацоўніцтва, павышэнне якасці жыцця людзей, захаванне сямейных каштоўнасцяў і народных традыцый».

Сенатар падкрэсліла, што адносіны ў Мінска і Ташкента наладжаны даўно. «Менавіта сяброўства з Узбекістанам дапамагло Беларусі два гады таму кампенсаваць страты ад санкцый Захаду, а гэта сотні мільёнаў долараў, — удакладніла Людміла Сапега. — Калі ж казаць аб прадпрыемствах, то толькі ў Беларусі з інвестыцыямі з Узбекістана паспяхова працуе каля ста, столькі ж толькі з беларускімі інвестыцыямі ва Узбекістане. Лічба немалая, але, як гаворыць кіраўнік нашай дзяржавы, можам і больш. Можам! Нават нягледзячы на няпростыя эканамічныя ды палітычныя рэаліі. Наадварот, яны сталі яшчэ адным імпульсам да таго, каб сустрэчы на самым высокім узроўні праводзіліся часцей, а форум, які аб'ядноўвае жаночую бізнес-супольнасць, стаў традыцыйным».

Парламентарый упэўнена, што па выніках форуму будзе пашырана міжнароднае супрацоўніцтва з Узбекістанам, а ўлічваючы прыстаўку «жаночы», ён стане ўнікальнай дыялогавай пляцоўкай, набудзе свой асаблівы, непаўторны стыль і працягне прырастаць смелымі, амбіцыйнымі ініцыятывамі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# Ці фарбуюць дэпутаты лавачкі?

## Бажэна ЯРЭМІЧ зладзіла свята для выхаванцаў спецыяльнай установы

**СЛУХАЦЬ людзей і своечасова прымаць рашэнні на месцах — важныя задачы для дэпутацкага корпуса ўсіх узроўняў. Дэпутаты на пастаяннай аснове праводзяць дыялогавыя пляцоўкі, круглыя сталы, прыёмы і асабістыя сустрэчы з грамадзянамі, выбаршчыкамі, удзельнічаюць у розных пасяджэннях. Гэта стала неад'емнай часткай іх работы. Аднак, акрамя дзелавых і афіцыйных сустрэч, яны нярэдка бяруць удзел у рэспубліканскіх суботніках і іншых акцыях, накіраваных на добраўпарадкаванне тэрыторыі. Так, дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, дырэктар — мастацкі кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці Бажэна Ярэміч разам з фіналісткай конкурсу «Міс Беларусь — 2023» паўдзельнічалі ў праекце «Гарадское асяроддзе». Прыгажуні наведалі сталічны спецыяльны дзіцячы сад № 408, падарылі незабыўнае свята для самых маленькіх выхаванцаў дашкольнай установы, адкрылі новы інтэрактыўны пакой і абнавілі гульнявую пляцоўку.**



Праект «Гарадское асяроддзе» — гэта ініцыятыва партыі «Белая Русь». Ён накіраваны на добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый з прыцягненнем жыхароў горада і дэпутатаў. Сутнасць праекта заключаецца ў тым, што дэпутаты гатовыя працаваць поплеч са сваімі выбаршчыкамі, унікаць у іх праблемы і патрэбы. Стваральная праца на карысць роднай краіны аб'ядноўвае, а нефармальныя зносіны дапамагаюць выбудаваць цесныя кантакты паміж прадстаўнікамі ўлады і грамадзянамі. Такім чынам, самы прыгожы дэсант наведаў адну з дашкольных устаноў сталіцы, каб зрабіць яе яшчэ больш утульнай.

Акрамя гэтага, дэпутат і ўдзельніца конкурсу «Міс Беларусь — 2023» узялі ўдзел у адкрыцці новага інтэрактыўнага пакоя для дзяцей. Па словах Бажэны Ярэміч, у ім мадэрнізаваны элементы для сенсорнай інтэграцыі, якія паспрыяюць далейшаму развіццю гаворкі.

«Дашкольная ўстанова знаходзіцца на тэрыторыі маёй Багдановіцкай выбарчай акругі. З гэтым дзіцячым садам, ды не толькі з ім, мы актыўна ўзаемадзейнічаем. Працуючы над мадэрнізацыяй дзіцячага пакоя, атрымалі запрашэнне на яго ўрачыстае адкрыццё і, вядома ж, з радасцю прынялі яго», — дадала Бажэна Віктараўна.



Яна адзначыла, што дэпутацкі корпус, Нацыянальная школа прыгажосці, фіналісткі конкурсу «Міс Беларусь» і «Міс Мінск» часта ўдзельнічаюць у дабрачынных акцыях па падтрымцы дзяцей, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах. «Сёння мы прыехалі парадаваць яркія эмоцыі дзеткам, тым самым хочам прыцягнуць увагу да гэтай дашкольнай установы. Людзі павінны ведаць, што тут створана ўся неабходная інфраструктура для развіцця дзяцей з маўленчымі асаблівасцямі», — сказала дэпутат.

Паводле яе слоў, планецца прыцягненне ўвагі грамадства для таго, каб людзі не баяліся аддаваць у спецыяльныя ўстановы сваіх дзяцей. «Таму мы працягнем наведваць такія месцы і абавязкова пашырым геаграфію наведванняў не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй нашай любімай краіне», — падагульніла Бажэна Ярэміч.

Сёння дашкольную ўстанову наведваюць 78 дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення. Штодня з імі займаюцца настаўнікі-дэфектолагі, таму ў школу хлопчыкі і дзяўчынкі пераходзяць з развітым маўленчым апаратам, расказала **загадчыца ўстановы Таццяна ТРЫГУБОВІЧ.**

Пасля ўрачыстага адкрыцця новага інтэрактыўнага пакоя прыгажуні добраўпарадкавалі дзіцячую пляцоўку: пафарбавалі лавачкі, гульнявыя комплексы, арэлі і іншыя элементы. У завяршэнне візіту дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Бажэна Ярэміч адзначыла, што яшчэ застаецца шэраг пытанняў, якія трэба будзе вырашыць з адміністрацыяй раёна. У прыватнасці, патрабуюцца рамонтныя работы: замена вокнаў, турнікоў і лавачак.

У беларускіх прыгажунь праца віты характар. У найбліжэйшы час плануецца наведванне новых аб'ектаў, дзе неабходна добраўпарадкаванне. Геаграфія — уся краіна.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# «ДРЫБІНСКІЯ ТАРЖКІ» — СВЯТА НАРОДНАЕ

## На рэгіянальным фэсце дэпутаты прэзентавалі сялянскі быт пачатку мінулага стагоддзя

**Ні адно свята не абыходзіцца без удзелу дэпутатаў. І Рэгіянальны фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» не выключэнне. Сельсаветаў у Дрыбінскім раёне чатыры, самы буйны — Міхееўскі. Як жартуюць мясцовыя дэпутаты, астатнія тры — Першамайскі, Раснянскі і Чэрнеўскі — яго спадарожнікі. На фестывалі агульны дэпутацкі падворак быў адным з каларытных.**





«Дрыбінскія таржкі» — не толькі валёнкі і шапавалы, станцыі якіх з'яўляецца гарадскі пасёлак. Гэта яшчэ і цудоўная магчымасць далучыцца да векавых традыцый і абрадаў, парадавацца, якая самабытная і цікавая наша гісторыя. У старадаўнія часы ў жніўні народ з'язджаўся ў Дрыбін на вялікі кірмаш. Сяляне прадавалі яйкі, масла, сыры ўласнай вытворчасці, везлі на продаж дамашнюю жывёлу і птушку. Было шумна, весела і святочна. Арганізатары фэсту паклапаціліся адрадзіць даўнюю традыцыю ў выглядзе фестывалю. Гэтым разам тэмай яго стала падарожжа ўглыб вякоў — «Ад вытокаў да сучаснасці». У фестывальнай афішы чаго толькі ні было: майстар-класы па народных промыслах і рамёствах, конкурсы, гульнявыя атракцыёны, гастрафэст ад мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый, канцэрты. Кожны падворак быў аформлены з улікам далёкай гісторыі. Напрыклад, сельсаветы прапанавалі перанесціся на сто гадоў таму і паглядзець, як жылося нявестам раней і цяпер. Кіраўнік спраў Міхееўскага сельсавета Кацярына Гецман напісала сцэнарый, а калегі з іншых сельсаветаў дапамаглі яго ажыццявіць.

Каларытная брунетка Кацярына Гецман прымярала на сябе вобраз дзяўчыны Веры. Адзела яркую спадніцу, завязала хустку, начапіла на шыю чырвоныя каралі, і атрымалася прыгажуня часоў маладой савецкай краіны. Так, на думку Кацярыны, выглядалі тады дзяўчыны, якія збіраліся замуж. Бландзінка Людміла Буранкова, яе калега з Чэрнеўскага сельсавета, узяла на сябе ролю сучаснай нявесты Веранікі. Смяецца, што нядаўна выдала замуж дачку — успаміны свежыя. Дыялог дзвюх нявест пабудаваны на кантрастах.

— Напрыклад, Вера падмятае дом звычайнай мяцёлкай, а я карыстаюся робатам-пыласосам, — расказвае Людміла-Вераніка. — У Веры бабуліны пантофлі, а я ў інтэрнэт-краме замовіла модныя красоўкі. Дзяцей мы не хочам, у нас коцік, а Вера аж шасцёра плануе нарадзіць. Я па сцэнарыі ў жаху: «Якіх яшчэ дзяцей? Трэба пажыць для сябе. У нас коцік Лакі ёсць. Ведаеш, колькі грошай у яго ўклалі? Кіпцяточка, прышчэпкі, корм і шмат чаго іншага».

Прадстаўніцы Першамайскага і Раснянскага сельсаветаў размеркавалі паміж сабой абавязкі асістэнтаў. Весела ўсё атрымалася. Народ пацешылі і сябе пацешылі.

— «Дрыбінскія таржкі» праходзяць у нас штогод, мы іх любім, рыхтуемся да іх, — кажа Людміла Буранкова. — Кожны раз нешта новае для нашых жыхароў прыдумваем. І з падтэкстам, каб на ўзбраенне бралі. Сёння дзяўчаты зусім развучыліся быць жанчынамі, мы ім пра гэта і нагадваем.

— Затое работа дэпутата ні кропелькі не змянілася, — прызнаецца Кацярына Гецман. — Што сто гадоў таму рабілі, што цяпер — адно і тое ж: як працавалі на карысць людзей, так і працуем. Раней, праўда, больш рукамі, сёння ўсё камп'ютарызавана.

Суразмоўніцы прызнаюцца, што да свайго выступлення рыхтаваліся грунтоўна. Шукалі рэквізіт, каб параўнаць, што было і што стала. Напрыклад, раней тэлевізар замянялі вясёлыя вячоркі, пыласос — мятла, тыя ж красоўкі — лапці або пантофлі. Жылі хоць і небагата, але весела. І актыўных людзей было болей. Цяпер яны на вагу золата. Як, напрыклад, староста з Пакуцця Ніна Галачкіна. Кацярына Гецман папрасіла яе праз газету павіншаваць — так атрымалася, што фестываль супаў з днём нараджэння старасты: ёй споўнілася 70 гадоў.

— Выключная жанчына, пра яе нават наша мясцовая прэса пісала, — паведаміла Кацярына. — Яна вельмі актыўная, заўсёды на сувязі з народам, з'яўляецца пасрэднікам паміж сельсаветам і жыхарамі. Заўсёды тэлефануе, калі нешта трэба зрабіць. А яе двор падобны на казку. Вельмі каларытны: мангал на колах, клумбы яркія, дом зроблены пад даўніну. Яна задае тон усім астатнім жыхарам.

Дэпутат запэўнівае, што святы вельмі аб'ядноўваюць народ. Галоўнае — выбраць цікавую тэму. Тыя ж Дні вёсак праводзяцца не ў выпадковыя дні — прымяркоўваюцца да памятных дат. Падчас сустрэч успамінаюцца землякі, якія нешта зрабілі для раёна або сёння славяць яго сваімі добрымі справамі.

— У наш сельсавет уваходзіць 36 населеных пунктаў, амаль у кожным адзначаем Дзень вёскі. Выключэнне — толькі тыя, дзе жыве ўсяго 1—3 жыхары, — расказвае Кацярына. — Тады мы ладзім адно свята на дзве вёскі, каб нічога з памяці не сціралася. Сёлета плануем устанавіць у Міхееўцы памятны знак. Жыхары сабралі грошы на яго. Гэта вёска перасяленцаў з Краснапольскага і Слаўгарадскага раёнаў, жыхары вырашылі пазначыць гэты факт на вялікім камені.

Кіраўнік спраў Першамайскага сельсавета Алена Герасіменка лічыць, што святы не проста згуртоўваюць людзей, а робяць іх больш ініцыятыўнымі. Бо гэта яшчэ і магчымасць нешта важнае абмеркаваць, выступіць з прапановай. І нават сама падрыхтоўка да свята — нагода зрабіць свой населены пункт больш прывабным.

— Перш за ўсё трэба навесці парадак на прылеглых тэрыторыях, добраўпарадкаваць іх, — тлумачыць суразмоўніца. — Калі трэба, нешта падфарбаваць, пасадзіць кветкі, дрэвы.

Сёлета ініцыятыва мясцовай жыхаркі Зінаіды Галдобінка атрымала падтрымку ў вобласці. Прапанову добраўпарадкаваць воінскае пахаванне ў вёсцы Шчокатава падтрымалі жыхары. Падчас вайны там знаходзіўся ваенны шпіталь, непадалёк ад яго хавалі чырвонаармейцаў, якія памiралі ад ран. Жыхары пажадалі абнавіць воінскае пахаванне. Ужо закуплена ўсё неабходнае: мемарыяльныя пліты, плітка бардзюрная. Будзе зроблена рэканструкцыя самога помніка.



Вольга Свірыдава, якая працуе ў Раснянскім сельсавеце кіраўніком спраў, згодна з калегамі, што «Дрыбінскія таржкі» — свята народнае, яно знаёміць людзей з гісторыяй краю, прывівае моладзі любоў да малой радзімы. Сюды прыязджае шмат турыстаў з усёй краіны. І гэта добры шанц прыцягнуць да сябе ўвагу. Раснянскі сельсавет, дарэчы, вельмі цікавы з пункту гледжання турызму. На яго тэрыторыі знаходзіцца старадаўні касцёл, Грымячая крыніца, сядзіба пана Спыткі ў Заполлі.

— Нашы дэпутацкія падворкі на «Дрыбінскіх таржках» адны з самых цікавых, — запэўнівае Вольга Свірыдава. — Прыдумваем розныя мерапрыемствы, каб народ прывабіць. Ну, і дэпутацкую нашу марку трымаем. У конкурсе на найлепшы падворак заўсёды займаем 1-2 месцы.

**Старшыня Дрыбінскага райсавета Цімафей МАРЦІНОВІЧ** рэзюмуе, што рэгіянальны фестываль «Дрыбінскія таржкі» дае магчымасць яшчэ раз паказаць людзям, што мясцовыя дэпутаты — галоўныя іх сябры і памочнікі.

— Асноўныя нашы абавязкі — работа з насельніцтвам, — кажа ён. — Дапамагаем прыбіраць аварыйныя дрэвы, людзям сталага ўзросту па меры магчымасцяў пакасіць траву, зрабіць нейкую іншую работу. Яднаюць насельніцтва агульныя святы. Дэпутаты нікол іх не прапускаюць. І, нягледзячы на тое, што фестываль супаў з летняй Спартакіядай, якую праводзяць абсалютна, частка дэпутатаў адправілася абараняць спартыўны гонар Дрыбіншчыны, а частка задзейнічана ў «Дрыбінскіх таржках».

У камандзе Дрыбінскага райсавета працуе 25 дэпутатаў, іх увагай ахоплена болей чым 100 населеных пунктаў, дзе пражывае больш як дзевяць тысяч чалавек. І вельмі дапамагаюць ім у рабоце старасты — іх у раёне каля 80.

— Яны ўсе актыўныя, неабыякавыя, — кажа старшыня райсавета. — Напрыклад, Тамара Паўлаўна Сільчанка з вёскі Шастакі Першамайскага сельсавета ініцыравала пабудову царквы ў сваёй вёсцы. Нядаўна там прайшло свята вёскі. Зімаваць у Шастаках застаюцца лічаныя людзі, а яна змагла сабраць каля 100 чалавек. Гэта і пенсіянеры, і моладзь. Весела і шматлюдна было і на свяце вёскі Праабражэнск. Рыхтуемся да Дня сельсавета — штогадовага свята, калі адзін з сельсаветаў паказвае свае дасягненні, напрацоўкі, змены, якія адбыліся. Плануем у верасні правесці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Дрыбін.*

### ❍ У тэму

**Намеснік старшыні Дрыбінскага райвыканкама Наталля ДУБІКОЎСКАЯ:**

— Фестываль «Дрыбінскія таржкі» аб'ядноўвае людзей, адраджае культурныя промыслы. Усе арганізацыі стараюцца напоўніць яго зместам, прымаюць у ім актыўны ўдзел. Вельмі прыемна, што свята цікавіць моладзь. Геаграфія фестывалю пашыраецца кожны год. Людзі з'язджаюцца з усіх куточкаў вобласці, краіны. І мы рады ўсім. Сёлета прыехала шмат творчых калектываў з Беларусі і Расіі, болей чым 70 майстроў. Праграма «Дрыбінскіх таржкоў» заўсёды насычаная, першы дзень традыцыйна прысвячаецца дзецям, вечарам адбываецца маладзёжная праграма. На другі фестывальны дзень запланавана шмат розных канцэртаў, конкурсаў, відовішчаў. Сёлетні год наогул для нас адметны: 455 гадоў таму ўпершыню згадваецца наш населены пункт, 100 гадоў прайшло са дня ўтварэння раёна, 80 гадоў — са дня вызвалення вобласці і Беларусі і 35 гадоў — са дня аднаўлення раёна. 29 снежня 1989 года раён быў створаны наноў. Ён тройчы расфарміроўваўся, але даказаў, што мае права на самастойнае існаванне. Усё гэта вельмі сімвалічна і патрыятычна.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.896. Нумар падпісаны ў 19.30 20 жніўня 2024 года.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# ВАЖКАЯ ПРАБЛЕМА



## Чаму дзеці набіраюць вагу і як спыніць пандэмію атлусцення?

**Атлусценне называюць неінфекцыйнай пандэміяй XXI стагоддзя. Ключавы фактар рызыкі, які правакуе атлусценне, — гэта бездакзнае стаўленне да рацыёну харчавання. Узроставая структура атлусцення сёння мае тэндэнцыю да амаладжэння. Часта атлусценне выяўляюць у дзяцей і падлеткаў, і колькасць упершыню выяўленых выпадкаў штогод расце. Па словах педыятраў, дзеці з атлусценнем часцей адчуваюць неспакой, дэпрэсію, маюць нізкую самаацэнку.**
**20 % дзяцей ва ўзросце 5—15 гадоў маюць лішнюю масу цела. Прычына — няправільнае харчаванне і нізкая фізічная актыўнасць. Даследаванні паказваюць, што больш чым у 50 % дзяцей у рацыёне пераважаюць насычаныя тлушчы, соль, дабаўлены цукар. Пры гэтым малочных прадуктаў, мяса, рыбы, гародніны і садавіны нашы дзеці ядуць недастаткова. З нізкім спажываннем малака звязаны недахоп кальцыю ў арганізме — адсюль у дзяцей ва ўсіх узроставых групах высокая частата астэапарозу (захворвання, якое раней сустракалася толькі ў пажылых). Плюс да гэтага нізкая забяспечанасць вітамінамі A, D і ёдам. А значыць, паніжаныя паказчыкі здароўя.**

### Пагроза цукровага дыябету, нізкая самаацэнка, дэпрэсія

Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у індустрыяльных краінах ад 10 да 40 % дзяцей маюць лішнюю вагу, 15 % дзяцей маюць атлусценне. За 40 апошніх гадоў колькасць школьнікаў з атлусценнем вырасла ў свеце больш чым у 10 разоў — з 11 да 124 мільёнаў. А 216 мільёнаў школьнікаў маюць лішнюю вагу цела. Адначасова адзначаецца ссоўванне піку маніфестацыі і развіцця дзіцячага атлусцення ў больш ранія ўзроставыя перыяды. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, то да 2025 года колькасць дашкольнікаў, якія будуць мець атлусценне, павялічыцца да 70 мільёнаў.

— Дзіцячае атлусценне з'яўляецца адным са значных фактараў рызыкі развіцця цукровага дыябету другога тыпу, — акцэнтуе ўвагу **галоўны пазаштатны эндакрынолаг Міністэрства аховы здароўя, дырэктар РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі Анжаліка СОЛНЦАВА.** — Гэта інсулінанезалежны цукровы дыябет, ён узнікае ў людзей старэйшага ўзросту, у сярэднім пасля 50—60 гадоў. Але сёння мы адзначаем выпадкі цукровага дыябету 2-га тыпу ў падлеткаў.

Акрамя гэтага, дзіцячае атлусценне з'яўляецца фактарам рызыкі развіцця розных парушэнняў кардыяваскулярнай сістэмы, розных відаў парушэнняў тлушчавага абмену, дысліпідыміі, можа быць трыгерам развіцця некаторых відаў раку, захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, артапедычнай паталогіі, а таксама вядзе да нізкай самаацэнкі і іншых псіхалагічных праблем.

— Атлусценне аказвае ўплыў і на псіхалагічны статус. Нярэдка такія школьнікі маюць псіхалагічныя і эмацыянальныя праблемы, якія з'яўляюцца вынікам так званай сацыяльнай ізаляцыі. Такія дзеці адыгрываюць менш значную ролю ў соцыуме, з'яўляюцца больш ізаляванымі, у іх меншае кола сяброўскіх сувязяў у параўнанні з равеснікамі з нармальнай масай цела. Яны ўспрымаюцца ў школе як больш лянівыя і непаспяховыя, з імі менш кантактуюць. Гэта вядзе да нізкай самаацэнкі, развіцця розных эмацыянальных праблем і высокага працэнта дэпрэсіўных станаў, — адзначае Анжаліка Солнцава.

Яна звярнула ўвагу на так званае марбіднае атлусценне, у аснове якога ляжыць механізм кампульсіўнага пераядання. Калі мы ядзім нешта смачнае, павышаецца наш эмацыянальны фон, паляпшаецца настрой. Дзіцяці гэта дапамагае пераадолець стрэс. У выпадку недастатковага выкарыстання іншых відаў стымуляцыі (напрыклад, рухальных, гукавых) смакавая стымуляцыя замацоўваецца на ўзроўні рэфлексу. Выглядае гэта наступным чынам: дзіця есць нешта смачнае, атрымлівае задавальненне і знімае стрэс. Калі ў малых ёсць праблемы з эмацыянальным фонам,



паталагічная смакавая стымуляцыя замацоўваецца, уваходзіць у звычку, і яны несвядома пачынаюць ужываць значна большыя аб'ёмы ежы.

### Вінаватыя гены?

Прыкладна ў 90 % усіх выпадкаў гэта аліментарнае атлусценне. Яно абумоўлена неадпаведнасцю нізкай рухальнай актыўнасці і пераяданнем. Прычым часам гэта можа быць не столькі пераяданне, колькі менавіта гіпадынамія.

Харчаванне падчас цяжарнасці вызначае, будзе ў будучага дзіцяці атлусценне ці не. Часта яно можа пачынацца не адразу, а праз 10 гадоў пасля нараджэння. Як адзначае Анжаліка Солнцава, ёсць унутрычэраўныя фактары праграмавання атлусцення. Яны, як і некаторыя іншыя, становяцца трыгерамі яго развіцця ў раннім узросце. Перш за ўсё гэта лішняя маса цела саміх бацькоў, значнае павелічэнне масы цела цяжарнай жанчыны, парушэнне вугляводнага абмену падчас цяжарнасці (гестацыйны цукровы дыябет), курэнне жанчыны падчас цяжарнасці, кесарава сячэнне, нараджэнне паўнавагавых, больш за 4 кг, дзяцей і малаважкіх дзяцей з затрымкай унутрычэраўнага развіцця, а таксама ранняе штучнае кармленне, хуткае павелічэнне масы дзіцяці ў першыя два гады жыцця, кармленне дзіцяці з абавязковым праглядам тэлевізара, мабільнага тэлефона, нездаровыя сямейныя харчовыя звычкі.

— Кажучы пра генетычны фон, на сёння ім можна растлумачыць да 40 % усіх адрозненняў у масе цела. Дзіцячае атлусценне з'яўляецца не манагенным, а полігенным, гэта значыць, дзейнічае цэлы шэраг генаў, і з соцень генаў-кандыдатаў на сёння каля ста храмасомных участкаў адказваюць за развіццё атлусцення. Пэўнае спалучэнне гэтых генаў можа растлумачыць большую ці меншую ступень схільнасці да развіцця атлусцення. Але яшчэ раз падкрэслю: нягледзячы на тое, што ёсць генетычная схільнасць да развіцця атлусцення, яна рэалізуецца толькі пад уздзеяннем знешніх фактараў, — рэзюмавала Анжаліка Солнцава.

### Есці ў школе абавязкова!

Як падкрэсліла **прафесар кафедры гігіены і аховы здароўя дзяцей з курсам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДМУ Алена ГУЗІК,** у арганізаваных дзіцячых калектывах праводзіцца вялікая работа па ўдасканаленні арганізацыі харчавання. Аднак адказнасць за пытанні харчавання не толькі на кіраўніках і спецыялістах устаноў адукацыі, але і на бацьках. Паводле навуковых даследаванняў, 50 % нашага стану здароўя вызначае лад жыцця, а той у сваю чаргу на 50 % вызначаецца харчаваннем.

— Паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, колькасць простага цукру, які дзеці і дарослыя могуць ужываць, павінна складаць каля 10 % ад энергетычнай каштоўнасці сутачнага рацыёну. А мы падчас даследаванняў бачым, што іх атрымліваецца ў 2-2,5 раза больш. Таму размова сёння ідзе не пра тое, каб проста накарміць дзіця, а як правільна гэта зрабіць, — падкрэсліла прафесар.

Акрамя таго, паводле рэкамендацый, штодзённа трэба ўжываць каля 400 грамаў гародніны і фруктаў. Даследаванне, якое праводзілася ў Еўропе, паказала, што фрукты штодзённа ўжываюць ад 40—45 % дзяцей, аналагічная сітуацыя і ў Беларусі. Крыху менш дзяцей штодзённа ядуць гародніну — дзесьці каля 37 %. Яшчэ адна сур'ёзная праблема, звязаная з харчаваннем, — салодкія напоі. У Еўропе каля 17 % школьнікаў п'юць іх штодня, у нас каля 8,5 % дзяцей.

— Калі кажам пра харчаванне, павінны разумець, што гэта сур'ёзная адказнасць бацькоў. Колькі б у нашай краіне не арганізоўвалася гарачае харчаванне, калі раніцай дзіця не будзе снедаць, калі маці не будзе задумвацца, чым дзіця будзе абедаць і вячэраць у хатніх умовах, ніякія праблемы з атлусценнем мы вырашыць не зможам. Часта можна пачуць: я дам дзіцяці з сабой бутэрброд, яно з'есць яго ці возьме штосьці ў кафэ, а ў школе харчавацца не будзе. Чаму прынцыпова важна есці ў школе? Даследаванне паказвае, што каля 20 % дзяцей увогуле не снедаюць: у малодшых класах дзесьці 12—15 %, а ў старэйшых — да 25 %. Калі такое дзіця ў школе з'ядае бутэрброд, гэта атрымліваецца каля 15 % сутачнага рацыёну. І ўвесь аб'ём сутачнага харчавання прыпадае на хатнюю вячэру, а гэта фактар рызыкі развіцця лішняй масы цела і атлусцення. Таму маці павінна цікавіцца, што дзіця есць у школе, — патлумачыла Алена Гузік.

Яна падкрэсліла, што ў 2023 годзе праводзіўся маштабны праект па ўдасканаленні харчавання школьнікаў.

— Я асабіста ў ім брала ўдзел, мы бачылі, якая работа праводзіцца па ўдасканаленні харчавання. А дзеці ўсё роўна часам не ядуць. І тут задача бацькоў — растлумачыць, што калі хочаце, каб была добрая працаздольнасць на працягу ўсяго дня, то трэба харчавацца. Захаванне рэжыму харчавання, ужыванне дастатковай колькасці гародніны і фруктаў, бялку — тыя пытанні, якімі павінны займацца не толькі ўстановы адукацыі, дзіцячыя садкі, школы, летнія аздараўленчыя лагеры, але і бацькі, — дадала прафесар.

### Мала актыўнасці і сну, шмат камп'ютара

Закранула эксперт і пытанне рухальнай актыўнасці, адзначыўшы, што ў школе ў дзяцей ёсць два ўрокі фізічнай культуры і гадзіна здароўя і спорту. Пры гэтым рэкамендацыя Сусветнай арганізацыі аховы здароўя — актыўна рухацца 60 хвілін у дзень. Калі дзіця рухаецца на двух уроках фізкультуры і гадзіне здароўя і спорту, то дастатковай нагрузкі на сардэчнасасудзістую, дыхальную сістэмы, фарміраванне мышачнага гарсэта не будзе. Таму абавязкова павінны быць дадатковыя формы рухальнай актыўнасці: спартыўныя і танцавальныя секцыі, актыўныя прагулкі на свежым паветры.

— Нашы даследаванні паказваюць, што толькі каля 33 % школьнікаў займаюцца ў секцыях 1—3 разы на тыдзень, 12-13 % маюць іншыя формы рухальнай актыўнасці, таму фізічнай актыўнасці недастаткова. Затое каля трэці дзяцей па выніках анкетавання займаюцца з рэпетытарамі, наведваюць дадатковыя ўрокі англійскай мовы. Бацькі абавязкова павінны звяртаць увагу, якія формы актыўнасці ёсць у дзяцей, і, канешне, яны павінны прыносіць задавальненне, — адзначыла Алена Гузік.

Яшчэ адзін негатыўны фактар — камп'ютар і іншыя гаджэты. Па даных анкетавання, 60—70 % дзяцей праводзяць за камп'ютарам дзве гадзіны і больш штодзень.

— У нашым дзяцінстве было шмат гульняў на вуліцы. Сёння, калі дзеці столькі сядзяць за камп'ютарам, безумоўна, фарміруюцца адхіленні ў стане здароўя. Трэба знаходзіць спосабы адцягнуць дзіця ад гаджэтаў, каб яно было на вуліцы, займалася актыўнымі гульнямі — гэта пытанне, якое фарміруе здароўе. І тое звязана не толькі з развіццём атлусцення. Гэта і ўздзеянне сіняга колеру на фарміраванне зрокавага аналізатара, статычнае напружанне, калі дзіця працяглы час сядзіць у вымушанай рабочай позе. Падчас каранавіруснай ізаляцыі былі распрацаваны рэкамендацыі: школьнік можа не больш за дзве гадзіны знаходзіцца за камп'ютарам, больш старэйшыя дзеці — каля 3,5 гадзіны. І гэта час і на навучанне, і на забавы. У нас жа лічбы нашмат большыя, — засяродзіла ўвагу Алена Гузік.

Яшчэ адзін важны момант — працягласць начнога сну. Ён павінен быць 8-9 гадзін, і важна, каб дзеці клаліся спаць не пазней за 22 гадзіны. Даследаванні паказваюць, што каля трэці дзяцей спіць сем і менш гадзін за суткі, прычым не толькі ў вучэбныя дні, але і ў выхадныя. Гэта таксама адзін з фактараў, які фарміруе здароўе.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком не менее 3 лет для производственных целей (за исключением вредных производств), осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений, офисов.

Аукцион состоится **12.09.2024 г. в 11.00**
по адресу: **230025, г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4-й этаж, актовый зал.**

**Лот № 1.**

### Капитальное строение, отделение связи,

одноэтажное здание, помещения на 1-м этаже, расположенные по адресу:
**Гродненская обл., г. Гродно, ул. Ткацкая, 18, площадью 40,7 кв. м (22,1; 10,1; 4,6; 3,9).**

Начальная цена продажи составляет 180 руб. 71 коп.
Размер задатка составляет 180 руб. 71 коп.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу:
г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29, 3-й этаж, каб. 302,
с 19.08.2024 г. по 11.09.2024 г. включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00).

Документы, поданные после 16.00 11.09.2024, не рассматриваются.
Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Гродненского филиала, находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29.
Телефон для справок: (8-0152) 68-59-96, факс (8-0152) 60-44-36.

Извещение о проведении открытого аукциона опубликовано на официальном сайте Государственного комитета по имуществу – https://au.nca.by/auction/25726.

УНП 500826554

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)*
по поручению **ОАО «Агро-Дубинское»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

### Лот № 1: комплексный приемный пункт

**с инв. № 632/С-25993 общ. пл. 108,1 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 622081702601000222 (право постоянного пользования) площадью 0,1650 га по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Воложинский с/с, д. Брильки, 102.**
**На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: водоохранная зона рек и водоемов (0,1650 га), охранная зона линии электропередачи (0,0115 га).**
Начальная цена с НДС (20 %) – **14 160,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 1 416,00 бел. руб.

### Лот № 2: мастерская

**с инв. № 632/С-31610 общ. пл. 312,6 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 622083006301000216 (право постоянного пользования) площадью 0,0427 га по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Дорский с/с, 1, 0,11 км западнее д. Сугвозды.**
**На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (0,0427 га).**
Начальная цена с НДС (20 %) – **59 040,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 5 904,00 бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001693 30000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **24.09.2024** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.09.2024** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра +37529-376-87-46.**

УНН 600017962

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
**ОАО «17 Сентября»** (Продавец)

Аукцион состоится **03.09.2024** в **11.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

### Лот № 1. Лядовня,

инв. № 621/С-1029019, 81,1 кв. м,
Минская обл., Несвижский р-н, Липский с/с, 13, вблизи д. Заушье.
Земельный участок 624283001601000413, 0,0114 га.
Обременение: историко-культурная ценность.
Начальная цена без учета НДС – 1 260,00 руб.
Задаток – 126,00 руб.

### Лот № 2. Мельница,

инв. № 621/С-1029020, 168,4 кв. м,
Минская обл., Несвижский р-н, Липский с/с, 14, вблизи д. Заушье;
Земельный участок 624283000001000003, 0,0171 га.
Обременение: историко-культурная ценность.
Начальная цена без учета НДС – 3 240,00 руб.
Задаток – 324,00 руб.

Шаг аукциона – 5 %. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 30.08.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРЯМОЙ ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ДОМА

*В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**ПРОДАЕТСЯ**

**одноэтажный бревенчатый одноквартирный жилой дом общей площадью жилого помещения 63 кв. м с хозяйственными постройками, расположенный по адресу: д. Орешковичи, ул. Центральная, д. 189 Березинского района Минской области.**

Цена пустующего дома – одна базовая величина – 40,00 (сорок белорусских рублей 00 копеек) с дополнительной компенсацией расходов, связанных с продажей дома.
С подробной информацией о продаже дома можно ознакомиться на официальном сайте Березинского районного исполнительного комитета.

**Тел. 80171531420,**
Дмитровичский сельский исполнительный комитет.

УНП 600038574

---

27.08.2024 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня
1) О членах наблюдательного совета общества.
2) О членах ревизионной комиссии общества.
3) О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.
Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
Дата сбора реестра акционеров 21.08.2024 г.
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 21.08.2024 г. (с 14.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «ДЗЕРЖИНСКИЙ РАЙАГРОСЕРВИС»**
(Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги состоятся 25.09.2024 в 11.00.**

### Лот № 1. Цех по ремонту комбайнов

с инв. № 620/С-24131, 1982 г. п., общая площадь 1484,6 кв. м.
Адрес:
Минская обл., г. Дзержинск, ул. 1-я Ленинская, 92А.
Земельный участок 622250100001005359 площадью 0,3277 га.
Обременения: аренда.
Начальная цена – 494 040,00 руб. с учетом НДС.
Задаток – 49 404,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **20.09.2024 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Слуцкий сыродельный комбинат» филиала «Здравушка-милк» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

лот № 1: недвижимое имущество в составе:
• **здание склада с двумя рампами** *(составные части и принадлежности: 3 пристройки, 2 рампы)*, **инв. № 613/С-13723, общей площадью 1728,8 кв. м;**
• **здание склада № 2** *(составные части и принадлежности: подвал, 2 пристройки, 2 схода, дымоходная труба, рампа)*, **инв. № 613/С-13720, общей площадью 1650,8 кв. м;**
• **здание склада № 6** *(составные части и принадлежности: пристройка)*, **инв. № 613/С-13721 общей площадью 304,1 кв. м;**
• **здание склада № 8, инв. № 613/С-13724, общей площадью (протяженностью) 423,2 кв. м;**
• **здание тарного склада, инв. № 613/С-13722, общей площадью 311,6 кв. м;**
• **здание склада строительного, инв. № 613/С-13725, общей площадью 188,9 кв. м.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623070004601000662 площадью 1,1894 га (право аренды по 06.08.2067) по адресу: Минская область, Крупский район, п. Крупский, ул. Пушкина, 1В.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранные зоны электрических сетей, пл. 0,0119 га; пл. 0,2410 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **291 275,14** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **29 127,51** бел. руб.
**Стоимость снижена на 40 %.**

Лот № 2: имущество в составе:
• **производственный корпус (составные части и принадлежности: склад-пристройка, 3 навеса) с инв. № 601/С-13163 общей площадью 4 112,6 кв. м;**
• **административно-бытовой корпус (составные части и принадлежности: пристройка) с инв. № 601/С-13165 общей площадью 880,4 кв. м;**
• **котельная с инв. № 601/С-29361 общей площадью 25,1 кв. м,**
• **контрольно-пропускной пункт с инв. № 601/С-29555 общей площадью 15,9 кв. м;**
• **канализационно-насосная станция с инв. № 601/С-29556 общей площадью 51,8 кв. м;**
• **водонапорная насосная станция с инв. № 601/С-29554 общей площадью 62,7 кв. м;**
• **сети водоснабжения (составные части и принадлежности: 15 участков водопроводной сети, 6 колодцев, 6 трубопроводных арматур, 2 резервуара запаса воды) с инв. № 601/С-30845;**
• **артскважина (составные части и принадлежности: артскважина, фильтр, электропогружной насос, здание артскважины) с инв. № 601/С-30846, общей площадью 9,5 кв. м;**
• **сети канализации (составные части и принадлежности: канализация хозяйственно-бытовая, 5 трубопроводов, 2 колодца, канализация ливневая, 4 трубопровода, 2 колодца, приямок, отстойник) с инв. № 601/С-30847;**
• **оборудование (роллета защитная 2200*2600 с инв. № 020635, роллета защитная 2200*3250 с инв. № 020636, автоматическая система учета электроэнергии (АСКУЭ) с инв. № 00879, котел КВГТ-100 с инв. № 020254, трансформатор 10-1-1У 50/5 с инв. № 00863, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000088, трансформатор ТМЗ 630/10-0,4-82У с инв. № 000089, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00861, трансформатор ТОЛ 10-1-1У 50/5 с инв. № 00862, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/5У2 с инв. № 00864, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00865, трансформатор ТОЛ 10-1-2-0,5СС/10Р 50/5 У2 с инв. № 00866, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/0,4-84-УЗ с инв. № 000078, трансформаторная подстанция 2КТП-630/10/4-84-УЗ с инв. № 000079, градирня ККТ-50 с инв. № 020169, градирня ККТ-50 с инв. № 020170, градирня ККТ-50 с инв. № 020171, градирня ККТ-50 с инв. № 020172).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623250100001001429 площадью 1,5918 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Логойск, ул. Я. Купалы, 15.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона р. Гайна, пл. 1,5918 га.*

Часть административно-бытового корпуса находится в аренде (сведения можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) – **3 120 885,58** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **312 088,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 40 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объектов производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в следующем размере: по лоту № 1 – 4 (четыре) процента, по лоту № 2 – 1,5 (полтора) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 10.02.2024, 22.05.2024.

Аукцион состоится **05.09.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.09.2024** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (029) 621-69-93.**

УНП 600119098

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего
**государственному предприятию «НЦОТ»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 24.09.2024.**

### Лот № 1. Дизель-генератор в защитном кожухе AKSA AD 275, инв. № 00272.

Год выпуска – 2015 г.
Начальная цена с учетом НДС – 97 560,00 руб.
**Местонахождение:** г. Минск.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества
**КУП «Магазин № 3 г. Несвижа»** (УНП 690298378),
объявляет о проведении **02.09.2024 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте ЭТП: **bankrottorg.by.**

Працяг тэмы

# ДРУГІ ХЛЕБ

## Як захаваць ураджай бульбы да вясны?

**Лета амаль праляцела, і неяк неўзаметку падкралася восень. Агароднікі «дамаўляюцца з канём», бяруцца за рыдлёўкі: у Беларусі стартуе штогадовы сезон уборкі бульбы.**

Добры ўраджай бульбы са свайго прысядзібнага або дачнага ўчастка — узнагарода за працу. І хочацца без страт захаваць яе вынік, каб парадаваць сям'ю смачнымі стравамі са сваёй бульбачкі і на Новы год, і ў лютым, і нават у сакавіку. Пра тое, як правільна захоўваць бульбу, расказвае **навуковы супрацоўнік аддзела тэхналогій вытворчасці, абароны і захоўвання бульбы РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» Віталь СЕРДЗЮКОЎ.**

***— Гэтымі днямі ў Беларусі стартуе сезон уборкі бульбы новага ўраджаю: не толькі на палях сельгаспрадпрыемстваў, але і ў асабістых прысядзібных гаспадарках, на дачных «сотках». Давайце пагаворым аб тым, як захаваць ураджай бульбы. Аснову правільнага захоўвання клубняў мы закладваем яшчэ на этапе іх уборкі?***

— Лёжкасць клубняў залежыць непасрэдна ад якасці матэрыялу, які закладваецца, і ўмоў захоўвання. На захоўванне трэба закладваць толькі якасную бульбу з мінімальнай колькасцю механічных пашкоджанняў. А каб ваша бульба была менавіта такой, неабходна выканаць шэраг тэхналагічных аперацый, адна з якіх — перадуборачнае выдаленне бацвіння зялёных раслін. Гэтым этапам агароднікі-аматары часам грэбуюць, і дарма. Выдаленне бацвіння дазваляе зменшыць ступень траўмавання клубняў пры ўборцы.

### БАЦВІННЕ — ДАЛОЎ!

— Асноўны спосаб выдалення бацвіння пры аматарскім вырошчванні бульбы — механічны, іншымі словамі, уручную. На невялікіх пляцоўках можна выкарыстоўваць трымер, а калі пасадкі займаюць значную плошчу, некаторыя агароднікі карыстаюцца бацвіннезбівалкай, што агрэгуецца з трактарамі. З моманту выдалення бацвіння да пачатку ўборкі павінна прайсці 2-3 тыдні, каб лупіна клубняў дасягнула дастаткова трываласці. Але трэба ўлічваць, што больш працяглае знаходжанне клубняў у глебе павялічвае небяспеку іх паражэння ўзбуджальнікамі хвароб, — падкрэслівае навуковец.

***— Ці трэба прыбіраць зрэзанае бацвінне з бульбяных насаджэнняў перад тым, як пачаць капаць бульбу?***

— Перад уборкай, пасля таго як раслінныя рэшткі (бацвінне, пустазелле) падсохнуць, іх можна выдаліць за межы поля, каб выключыць цяжкасці пры ўборцы. Заўважу, што ў ранніх, сярэдняранніх, а часам і ў сярэдняспелых сартоў бульбы ў залежнасці ад тэрмінаў пасадкі і пагодных умоў бацвінне засыхае натуральным спосабам (вегетацыйны перыяд скончаны, лісце і сцёблы высахлі). Таму бацвінне можна не выдаляць, а пачаць уборку ўраджаю ва ўстаноўленыя тэрміны.

***— Калі надыходзяць аптымальныя тэрміны ўборкі бульбы?***

— Для зімовага захоўвання бульбу трэба ўбіраць з канца жніўня і ў верасні, у залежнасці ад зоны вырошчвання і, скажам так, наяўных у вашым распараджэнні працоўных рэсурсаў на канкрэтным дачным участку. Прыступаем да ўборкі, калі клубні паспеюць, лупіна іх агрубее, пераважна ў сухое надвор'е. Уборку неабходна весці ў сціслыя тэрміны нават пры спрыяльных умовах, бо надвор'е восенню вельмі непрадказальнае. Тэмпература глебы і паветра падчас уборкі павінна быць не ніжэйшай за 10 °С. Крытычны тэмпературны парог адчувальнасці клубняў да пашкоджанняў складае каля 12 °С. Пры ніжэйшых тэмпературах узрастае колькасць пашкоджанняў. Напрыклад, у выпадку ўборкі пры 25 °С колькасць пашкоджанняў у два разы меншая, чым пры 5 °С пры механізаванай уборцы. У кастрычніку ж у Беларусі тэмпература паветра і глебы ўжо ніжэйшая, часта ідуць дажджы, і гэта можа адбіцца на захаванасці клубняў у зімовы перыяд. Калі ўбраць бульбу правільна, гэта забяспечыць атрыманне якасных клубняў для працяглага захоўвання, знізіць колькасць механічных пашкоджанняў і ступень праяўлення клубневых гніляў.



### РЫХТУЕМ КЛУБНІ

***— На захоўванне бульбу мы закладваем не адразу?***

— Вядома, так. Пасля таго як сабралі клубні, іх трэба пакінуць на 5—7 дзён у цёмным месцы для праяўлення клубневых хвароб. Заражаныя клубні за гэты час выявяцца, што дазволіць пры сартаванні выдаліць іх з агульнай масы. Аднаго дня для гэтага будзе недастаткова: мокрыя гнілі не паспеюць выявіцца. Важна, каб кожны сорт захоўваўся на гэтым этапе асобна. Значыць, нам спатрэбіцца дастаткова вялікае памяшканне. Гэта павінна быць цёмнае месца, без доступу святла, што асабліва важна для бульбы і бульбы на корм жывёлам (птушцы): пры трапленні святла клубні зелянеюць, утвараецца саланін. Для насеннай бульбы гэта не страшна, наадварот, павысіцца імунітэт клубняў падчас захоўвання.

***— Пасля таго як клубні вылежалі, перабіраем іх?***

— Так, прыступаем да сартавання і каліброўкі. Клубні дзеляцца на тры фракцыі (памеры): буйныя (выкарыстоўваем у ежу), насенныя (для пасадкі на наступны год) і дробныя (на корм жывёле). У працэсе каліброўкі з масы бульбы выдаляем усе хворыя і пашкоджаныя клубні. Для насеннага матэрыялу выкарыстоўваем клубні, улацівыя сорту, неўласцівыя — выбракоўваем. Пасля таго як клубні бульбы перабралі, неабходна, каб прайшоў лячэбны перыяд. У гэты час адбываецца гаенне ран, якія былі атрыманы падчас уборкі, а яго працягласць — каля 14—20 дзён у залежнасці ад тэмпературы. Калі тэмпература паветра нізкая, то працягласць лячэбнага перыяду павялічваецца. Пасля яго завяршэння клубні можна апусціць у склеп. Надыходзіць наступны перыяд — астуджэнне. Пры гэтым насенную бульбу неабходна дадаткова пакінуць для азелянення, а дробныя ці дэфектныя клубні з новага ўраджаю можна выкарыстоўваць для кармлення жывёл або птушкі.

### ВЫБІРАЕМ МЕСЦА

***— Пытанне, што хвалюе многіх агароднікаў, а таксама гараджан, якія набылі бульбу на зіму на сезонных кірмашах: як правільна выбраць месца для захоўвання клубняў?***

— Месца залежыць ад вашых аб'ёмаў і магчымасцяў (звязаных з умовамі пражывання). У ідэале гэта склеп. Можна захоўваць клубні і на балконе ў цёмнай скрыні без зазораў, але часова: пры тэмпературы паветра ніжэй за 2 градусы ёсць верагоднасць падмярзання клубняў у начны час. Пры захоўванні ў склепе за 15—20 дзён да закладкі клубняў на зіму варта правесці пабелку памяшкання вапнавым растворам (1,5—2 кг свежай гашанай вапны і 150—200 г меднага купарвасу на 10 л вады). Для хуткага прасыхання сцен і столяў у сумесь дадаюць кухонную соль. Абавязкова трэба выканаць прафілактычны рамонт электратэхнічнага абсталявання, стэлажоў, паліц і скрынь, дзе будуць знаходзіцца клубні.

***— Пры якой тэмпературы лепш за ўсё захоўваць ураджай бульбы?***

— Тэмпература захоўвання ў асноўны перыяд (лістапад—сакавік) залежыць ад біялагічных асаблівасцяў сорту. Ёсць сарты з непрацяглым перыядам спакою («Маніфест», «Вектар», «Рагнеда» і г. д.), іх захоўваюць пры тэмпературы +3—4 градусы. Сарты з сярэднім перыядам спакою («Лель», «Першацвет», «Нара», «Палац») патрабуюць тэмпературы захоўвання +4—5 градусаў. Існуюць сарты, якія адрозніваюцца працяглацю перыяду спакою клубняў падчас захоўвання («Скарб», «Брыз», «Дзясятка», «Журавінка»). Іх захоўваць можна пры +5—6 градусаў. Гэта аптымальныя тэмпературныя паказчыкі. Часта такой тэмпературы не ў прамысловых умовах дасягнуць немагчыма ў перыяд працяглага захоўвання, аднак трэба імкнуцца рэгуляваць тэмпературны рэжым шляхам выкарыстання вентыляцыйнай выцяжкі, якая нярэдка знаходзіцца ў столі. Пры паніжэнні тэмпературы ў склепе зачыняем выцяжку падручным матэрыялам, пры павышэнні — адчыняем, каб пусціць халоднае паветра і кісларод клубням.

Словам, у гэты перыяд важна пастаянна кантраляваць тэмпературу ў склепе, а таксама стан бульбы, якая захоўваецца. Калі з'яўляюцца ачагі гнілі, неабходна правесці дадатковую пераборку для ўхілення крыніц інфекцыі.

***— А якія спосабы захоўвання бульбы найбольш эфектыўныя?***

— Выбар спосабу захоўвання бульбы залежыць ад памяшкання і аб'ёму, які вы захоўваеце. Існуе некалькі асноўных спосабаў:

- насыпам (выкарыстоўваецца пры вялікіх аб'ёмах, у прасторным склепе, які падзяляюць на секцыі);
- у скрынях (для захоўвання можна выкарыстоўваць драўляныя і пластмасавыя скрыні рознага памеру);
- у сетках рознага аб'ёму (5—8 кг, 8—10, 18—20, 30—33 і каля 40 кг). Першы спосаб аптымальны пры захоўванні вялікіх аб'ёмаў аднаго сорту. Другі і трэці — больш працаёмкія, патрабуюць дадатковых матэрыяльных і працоўных выдаткаў, але пры іх выкарыстанні ў адным памяшканні можна захоўваць вялікую колькасць сартоў. Пры вырошчванні некалькіх сартоў бульбы і іх закладцы на захоўванне кожную скрыню або сетку неабходна падпісаць, каб «не страціць» сорт.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**





БЕЛАРУСБАНК

## ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):

| № объекта* | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (назначение: здание специализированное финансового назначения; наименование: учрежденческое) с инвентарным номером 231/С-11144 общей площадью 510 кв. м | Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Карла Маркса, 11 | 158 400,00 (сто пятьдесят восемь тысяч четыреста бел. руб. 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 26 400,00 (двадцать шесть тысяч четыреста бел. руб. 00 коп.) |
| 2 | Капитальное строение (назначение: здание специализированное автомобильного назначения; наименование: гараж) с инвентарным номером 231/С-11145 общей площадью 34 кв. м | Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Карла Маркса, 11 | 2 040,00 (две тысячи сорок бел. руб. 00 коп.), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 340,00 бел. руб. (триста сорок бел. руб. 00 коп.) |
| 3 | Капитальное строение (назначение: здание нежилое; наименование: сарай) с инвентарным номером 231/С-8534 общей площадью 29,9 кв. м | Витебская обл., Бешенковичский р-н, г. п. Бешенковичи, ул. Карла Маркса, 11 | 1 560,00 (одна тысяча пятьсот шестьдесят бел. руб. 00 коп.), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 260,00 бел. руб. (двести шестьдесят бел. руб. 00 коп.) |
| **Всего:** | | | **162 000,00 (сто шестьдесят две тысячи бел. руб. 00 коп.), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 27 000,00 (двадцать семь тысяч бел. руб. 00 коп.)** |

**Прим. Объекты недвижимости продаются в составе одного лота.*

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 25.09.2024.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 25.09.2024 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 26.09.2024 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 3 201,30 руб. (в т. ч. НДС 20 %): оконная роллета 2375х2015 (инв. номер 215990000332777), оконная роллета 2360х2010 (инв. номер 215990000332776), оконная роллета 1700х2500 (инв. номер 215990000332779), оконная роллета 2372х1980 (инв. номер 215990000332780), оконная роллета 2020х2036 (инв. номер 215990000332778), входная роллета 1165х2025 (инв. номер 215990000332775), теплосчетчик ТЭМ-05М-1 dy32 (инв. номер 215993339200000), счетчик активной электрической энергии ТРЕ (инв. номер 215990000005611), счетчик активной электрической энергии ТРЕ (инв. номер 215990000005612), кондиционер GENERAL CLIMAT GC CU S (инв. номер 215990000000839), кондиционер настен. Mitsubishu SRC71HE-S1 (инв. номер 207504), кондиционер потолочный в составе: Mitsubishi FDEN7 (инв. номер 340725), кондиционер FUJI RSW9R (инв. номер 215993310000045).

Также победителю аукциона либо единственному участнику необходимо заключить договор аренды с ОАО «АСБ Беларусбанк» сроком на 5 лет на часть нежилых помещений Объекта 1 площадью 174,99 кв. м (в т. ч. на 1-м этаже – 130,93 кв. м, на 2-м этаже – 44,06 кв. м) по арендной ставке не более 15,00 бел. руб. за 1 кв. м.

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8(029) 309-42-19.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона и место его нахождения** | **Одноквартирный жилой дом, расположенный по адресу: Минская обл., Березинский район, Богушевичский с/с, д. Михалево, ул. Центральная, д. 5** |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **18 сентября 2024 года в 10.00, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63** |
| **Продавец, его адрес и телефоны** | Богушевичский сельский исполнительный комитет Березинского района Минской области. Минская обл., Березинский район, аг. Богушевичи, ул. Коваленка, д. 63, Богушевичский сельисполком, конт. тел.: (801715) 62140, 62098. Эл. адрес: **bogushss@berezino.gov.by** |
| **Характеристика пустующего жилого дома** | Одноэтажный жилой дом, деревянный, общая площадь – 36 кв. м, печное отопление, крыша – шифер. Не зарегистрирован |
